Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 104 (28214) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Які дзень у цыган лепшы?

СТАР. 4




Праўдзівыя гісторыі ад чытачоў

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАЎХУТА, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Беларусь займае 5-е месца ў Еўропе па забяспечанасці воднымі рэсурсамі: забяспечанасць воднымі рэсурсамі на душу насельніцтва ў краіне (6,1 тыс. куб.м на чалавека ў год) блізкая да сярэднееўрапейскай, але пры гэтым значна вышэйшая, чым у суседніх краінах — Польшчы (1,7 тыс. куб.м на чалавека ў год) і Украіне (4,1 тыс. куб.м). Разам з тым падземныя водныя рэсурсы размеркаваны нераўнамерна: найбольшая колькасць залягання падземных вод адзначаецца на тэрыторыі Мінскай вобласці, найменшая — на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Наша краіна ў перспектыве не сутыкнецца з праблемай недахопу прэсных вод. Аднак гэта не значыць, што можна бяздумна выкарыстоўваць гэты бясцэнны рэсурс».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19921,00 | ▲ |
| Еўра | 22326,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 298,37 | ▲ |
| Укр. грыўня | 795,81 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПАСЛУХМЯНАЯ ЛАЗА ГАРАДОЦКАГА МАЙСТРА

**Васіль СІМАНОВІЧ жыве далёка ад сталіцы — у Гарадку Віцебскай вобласці, але кожны год майстар па лозапляценні прыязджае за 300 кіламетраў у Мінск, каб паўдзельнічаць у традыцыйным фестывалі-кірмашы «Вясновы букет» і паказаць, што ўмеюць гарадоцкія майстры.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Жыллё

# АРЭНДА НА МІНІМУМЕ

**Сталічныя эксперты жыллёвай арэнды адзначаюць, што ўжо цяпер на рынку прыватных здымных кватэр фіксуецца цэнавае дно. Кажуць, што танней ужо не будзе...**

**Звычайна прыватнае арэнднае жыллё Мінска пачынала таннець менавіта з першых дзён лета, калі павялічвалася прапанова (за кошт кватэр пенсіянераў, якія пераехалі жыць на дачы), а попыт у сезон канікул заўсёды мінімальны. Аднак ранейшыя тэндэнцыі сёння на рынку амаль не працуюць, бо цэннікі на арэнду жылля працягвалі зніжацца на працягу ўсяго года, і сёння яны ўжо дасягнулі свайго мінімуму. Пра існуючую сітуацыю на сталічным рынку ў сегменце доўгатэрміновай арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла спецыяліст аддзела жыллёвай арэнды аднаго з цэнтраў гандлю нерухомасцю Алена АГРЫЗКА.**

### З'явіліся аднапакаёўкі і за 150 USD

Гэта самы мінімальны цэннік для аднапакаёвых кватэр невялікіх плошчаў у старых пяціпавярховых дамах у нялепшых мікрараёнах. Больш за тое, пустыя слабенькія




кватэры або падобнае бюджэтнае жыллё з мэбляй савецкіх часоў можа часам прапанавацца і за 140 долараў.

Алена Агрызка адзначае, што па стаўцы арэнды ў межах 150-170 долараў цяпер магчыма адшукаць стандартную аднапакаёўку з дастатковым наборам мэблі і нават са свежым касметычным рамонтам практычна ў любым раёне горада. У гэтым выпадку будучы кватарант будзе мець нават неблагі выбар з некалькіх дзясяткаў варыянтаў.

СТАР. 4

■ Падпіска-2016

# ...КАБ СКАЗАЦЬ: «ПАЕХАЛІ!»

**Жарты нічога не варты, але ж часам праўдзяцца! Спадарыня Целяшэўская з Валожыншчыны гадоў колькі таму падзялілася каштоўным досведам, напісала:**

*Я святочную яду*
*Не гатую зранку,*
*Падпішуся на «Звязду» —*
*Прынясуць да ганка...*
*Варта мужу ў рукі ўзяць,*
*На канапу сесці —*
*Калі — дзень, а калі й... пяць*
*Не пытае есці!*

ЗВЯЗДА — Да чытача з любоўю!

Адчуваеце, якая істотная эканомія? І пры гэтым — яшчэ не ўся! Бо кожны з індывідуальных падпісчыкаў, апроч газеты (зазначым, найстарэйшай, адзінай са штодзённых беларускамоўнай, якая выходзіць пяць разоў на тыдзень), мае шанц на выйгрыш. Сярод прызоў (гл. «Звязда» за 2 чэрвеня г.г.) — сем двухмесных палатак (на кожную вобласць ды Мінск) і веласіпед коштам, дарэчы, амаль шэсць мільёнаў рублёў! На такім, відавочна, і ў сваты можна?!

А, галоўнае, для таго, каб на ім хуценька «паехаць», доўга запрагаць не трэба, як той казаў: дастаткова аформіць падпіску (на другое паўгоддзе, квартал), запоўніць прапанаваны купон (ён будзе друкавацца да 30 чэрвеня) і даслаць яго ў рэдакцыю. А там...

Нашы продкі вучылі: дагнаў — не дагнаў, а прабегчы можна...

Каб потым (уявіце) сесці на новенькі веласіпед і...

Вам з намі па дарозе! Ці не так?

# ДАРОЖНАЯ КАРТА ПА ВЫСОКІХ СТАНДАРТАХ

## Наша краіна і Сусветны банк гатовыя зрабіць узаемнае супрацоўніцтва больш маштабным і насычаным

**Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі па выніках сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з віцэ-прэзідэнтам Сусветнага банка па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі Сірылам Мюлерам.**

«У канцы гэтага года мы з вамі павінны будзем вызначыць дарожную карту, праграму нашага супрацоўніцтва на будучыню. Думаю, мы гэта зробім своечасова, і яна будзе не горшая, чым у папярэднія гады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць у адрас Сусветнага банка за існуючы ўзровень супрацоўніцтва. «У самыя цяжкія часы Сусветны банк прытрымліваўся свайго стылю работы. Мы заўсёды знаходзілі агульныя інтарэсы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, адзначыў падтрымку Сусветнага банка ў фінансаванні інфраструктурных праектаў, такіх, як будаўніцтва і рэканструкцыя дарог, ачыстка вады, мінімізацыя наступстваў катастрофы на ЧАЭС, перапрацоўка бытавых адходаў, мадэрнізацыя лясной гаспадаркі. «Менавіта з вашай падтрымкі пачалася гэтая мадэрнізацыя. І мы сёння практычна цалкам правялі імпартазамяшчэнне ў лясной гаспадарцы і працуем па самых высокіх стандартах», — сказаў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Вопыт супрацоўніцтва з вамі — адкрыты, прынцыповы — з'яўляецца для нас пэўнай школай. Гэтая сустрэча паслужыць далейшаму ўдасканаленню нашых адносін».

У сваю чаргу Сірыл Мюлер адзначыў, што для Сусветнага банка было вялікім гонарам аказваць садзейнічанне Беларусі ў апошнія некалькі гадоў. Ён падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за станоўчую ацэнку сумесных праграм. «І мы маем намер рухацца наперад», — сказаў ён, выказаўшы надзею, што будуць вызначаны «ключавыя пункты, на якія нам трэба звярнуць увагу».

На сустрэчы бакі абмеркавалі канкрэтныя напрамкі і праекты для развіцця далейшага супрацоўніцтва. Выказана гатоўнасць рабіць яго больш маштабным і насычаным. У прыватнасці, Сусветны банк гатовы і далей аказваць Беларусі садзейнічанне ў пытанні павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі, дыверсіфікацыі і мадэрнізацыі вытворчасцяў. Асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць далейшаму развіццю транспартнай інфраструктуры, зрабіўшы яе больш тэхналагічнай. І адзін з такіх інавацыйных праектаў рэалізуецца цяпер.

Яшчэ адзін перспектыўны напрамак для ўзаемадзеяння — падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, што дасць беларускім прадпрыемствам дадатковыя магчымасці для асваення новых рынкаў.

Бакі гатовы працягваць эфектыўнае супрацоўніцтва і ў такіх ужо традыцыйных сферах, як энергетыка, адукацыя, ахова здароўя і навакольнага асяроддзя. Важны акцэнт у час сустрэчы зроблены менавіта на развіцці чалавечага капіталу. У гэтым жа ключы падкрэслівалася, што галоўны прынцып супрацоўніцтва Беларусі і Сусветнага банка заключаецца ў справядлівасці, каб эканоміка працавала на людзей.

# ПРЫРАСТАЕМ НОВЫМІ ПРАЕКТАМІ

## Сусветнаму банку прапанавалі прафінансаваць будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск»

**Найбольш перспектыўным праектам для інвестыцый Сусветнага банка бачыцца будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», а таксама дадатковыя рэгіянальныя праекты ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкавання гарадоў. На гэтым зрабілі акцэнт падчас сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Групы Сусветнага банка па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі Сірылам Мюлерам старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ і прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй КАБЯКОЎ.**

На думку старшыні верхняй палаты беларускага парламента, банк можа ганарыцца сваім унёскам у поспехі, у садзейнічанне сацыяльна-эканамічнаму развіццю нашай дзяржавы. Міхаіл Мясніковіч назваў важнай ролю Сусветнага банка ў дыялогу нашай краіны з Міжнародным валютным фондам.

Сярод перспектыўных праектаў, якія старшыня верхняй палаты прапанаваў разгледзець у найбліжэйшы час — інвестыцыі ў будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», а таксама дадатковыя рэгіянальныя праекты ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкавання гарадоў.

На будаўніцтве другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» зрабіў акцэнт падчас сустрэчы з Сірылам Мюлерам і прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў. «Стратэгічна важным для нас з'яўляецца развіццё транзітнага патэнцыялу краіны, — патлумачыў Андрэй Кабякоў. — Сусветны банк ужо аказвае каласальную падтрымку ў гэтым кірунку, мы хацелі б запрасіць банк да ўдзелу ў новым праекце па будаўніцтве другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», стратэгічнага аб'екта транзітнага патэнцыялу нашай краіны».

Паводле яго слоў, па выпрацаванай праграме дзеяння на 2016—2020 гады ўрад нашай дзяржавы мае намер прытрымлівацца вызначанага курсу на забеспячэнне макраэканамічнай стабільнасці і мадэрнізацыі эканомікі. «Эканамічныя пераўтварэнні закрануць досыць шырокі спектр напрамкаў, — звярнуў увагу кіраўнік урада. — Гэта фарміраванне эфектыўных фінансавых рынкаў, падтрымка развіцця прыватнага сектара, умацаванне сістэмы сацыяльнай абароны, фарміраванне эфектыўных таварных рынкаў і рынку паслуг».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

■ Слова дэлегату

# Падтрымаць цывілізацыйны аспект



**— Культура, якую я прадстаўляю, з'яўляецца важным кампанентам нашага жыцця. Сёння трэба рабіць надзвычай важныя крокі па выхаванні пачуцця нацыянальнай годнасці, якое ў нас традыцыйна звязана з гістарычнай памяццю, — лічыць дэлегат Усебеларускага народнага сходу, дырэктар Гомельскага абласнога музея ваеннай славы Павел Ждановіч. — Вядома ж, чалавек без памяці нежыццяздольны. Таму, нягледзячы на пэўныя складанасці сённяшняй сітуацыі, культуру трэба падтрымліваць, бо яна мае цывілізацыйны аспект. Калі страцім пачуццё нацыянальнай годнасці — не будзе культуры паводзінаў, не будзе культуры кіравання і наўрад ці эканоміка будзе моцнай.**

Усебеларускі народны сход — гэта вельмі важны форум, які праводзіцца ў нашай краіне. Безумоўна, на ім вызначацца асноўныя праграмы, па якіх будзе развівацца дзяржава. Мы павінны выпрацаваць нейкія кірункі, якія прывядуць да станоўчых вынікаў.

Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі», якая працавала на працягу 2011-2015 гадоў, дала добры эфект. Мы змаглі камп'ютарызаваць у нашых раённых музеях фонды, набыць абсталяванне для пераводу дакументаў у лічбавы фармат. Таму ад дзяржавы мы і надалей чакаем крокаў, якія будуць садзейнічаць развіццю галіны; з другога боку, нам трэба развіваць навуковы патэнцыял супрацоўнікаў.

Мы вырашаем пытанні, якія тычацца маркетынгу, менеджменту, правільнай падачы нашай культурнай спадчыны, пазіцыявання нашай краіны. Прычым гэта трэба рабіць як ва ўнутраных, так і ў знешніх аспектах. Пры ўсёй важнасці эканамічных аспектаў мы сёння павінны захаваць сацыяльныя функцыі галіны. У прафесійнай культуры важна знайсці баланс паміж забаўляльнай функцыяй і навукова-асветніцкай.

Сёння нам трэба больш актыўна займацца культурна-адукацыйнай дзейнасцю, інтэграцыяй яе ў вучэбны працэс. Новае пакаленне дзяцей нарадзілася ўжо ў суверэннай незалежнай Беларусі, і таму сёння трэба шукаць новыя формы і метады падачы інфармацыі — у першую чаргу расказваць пра ўнікальнасць сваёй краіны. Маладое пакаленне павінна ведаць гісторыю Беларусі, каб ганарыцца сваёй Радзімай.

Нам трэба больш актыўна інтэгравацца і ў турыстычны працэс, бо менавіта ўстановы культуры з'яўляюцца асноўнымі турыстычнымі аб'ектамі. Таму нам неабходна знаходзіць і ўвасабляць агульныя ідэі з нашымі калегамі. Магчыма, у гэтым кірунку нам могуць дапамагчы новыя заканадаўчыя нарматыўныя дакументы, якія будуць спрыяць развіццю галіны.

Вельмі шмат у нашай дзейнасці звязана з памежжам — гэта і адукацыя, і спорт, і турызм. Магчыма, пэўны іх вопыт варты пераймання. Мы вельмі часта працуем па вядомай прыказцы: «Умела баба гатаваць, але не ўмела падаваць». Робім вельмі якасны прафесійны прадукт, але не заўсёды можам яго падаць і на высокім узроўні зрабіць яго прасоўванне. Таму вельмі важна ў нашай галіне вучыцца лепш прымяняць маркетынгавыя тэхналогіі. Трэба ўмець складаныя рэчы зрабіць не простымі, але даступнымі для разумення. Мы павінны спрыяць таму, каб пашыраўся светапогляд чалавека.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# КАЛІ ЎСЁ ВЫРАШАЕ КІРАЎНІК

**У Савеце Рэспублікі па ініцыятыве Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах адбыўся «круглы стол» на тэму «Кадравае забеспячэнне працэдур банкруцтва».**

— Для эканомікі настаў няпросты час. Сёння ад банкруцтва не застрахаваны ніхто, — лічыць **Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.** — Рэзкі спад попыту, немагчымасць расплачвацца па пазыках, складанасці ў прыцягненні крэдытаў здольныя ператварыць у банкрута любое паспяховае і ўстойлівае ў фінансавым плане прадпрыемства.

Па словах Уладзіміра Панцюхова, значнасць антыкрызіснага кіраўніка нельга недаацэньваць. Ад яго дзеянняў наўпрост залежыць вынік: адновіць сваю працу прадпрыемства альбо не. Згодна з заканадаўствам, такі кіраўнік — асоба незацікаўленая, якая дзейнічае ў роўнай ступені ў інтарэсах усіх крэдытораў. Але, як правіла, да антыкрызіснага кіраўніка вялікая колькасць патрабаванняў і чаканняў, не заўжды абгрунтаваных. Таму сенатар задаецца пытаннем: як зрабіць так, каб забяспечыць яго рэальную, а не прапісаную на паперы незалежнасць ад асоб, якія ўздзейнічаюць у справе аб банкруцтве, як разарваць нефармальныя, а часам і незаконныя сувязі некаторых кіраўнікоў з тымі, хто таксама задзейнічаны ў справе.

Па словах **Станіслава САДОЎНІКАВА, намесніка дырэктара дэпартамента па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі Беларусі,** у справе банкруцтва антыкрызісны кіраўнік адыгрывае ключавую ролю. На яго думку, што тычыцца заканадаўчага аспекту, нашай краіне варта звярнуцца да вопыту Расіі, у якой інстытут банкруцтва быў створаны на 8-10 гадоў раней, і прааналізаваць такім чынам допушчаныя памылкі і поспехі. «Тым больш што мы знаходзімся ў адным інтэграцыйным аб'яднанні з Расіяй», — падкрэсліў Станіслаў Садоўнікаў.

Па яго словах, у Беларусі ёсць і поспехі ў гэтай сферы. Напрыклад, у нас склаўся корпус антыкрызісных кіраўнікоў. «Гэта добра падрыхтаваныя па спецыяльных праграмах асобы, якія маюць юрыдычную, эканамічную ці іншую вышэйшую адукацыю. Сёняшні рынак такіх кіраўнікоў займаюць напалову юрыдычныя асобы — 104 чалавекі. Гэта станоўчы паказчык, да якога мы доўга ішлі, і да нашага досведу прыглядаюцца нават у Расійскай Федэрацыі. Але гэта не нагода спыняцца на дасягнутым», — адзначыў Станіслаў Садоўнікаў.

У «круглым стале» бралі ўдзел як члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі, так і прадстаўнікі Міністэрства эканомікі, Генеральнай пракуратуры, «Пріорбанка», Асацыяцыі антыкрызісных кіраўнікоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Дасягненні

# КУРС НА «ЗЯЛЁНУЮ» ЭКАНОМІКУ

**Летась эксперты Еўрапейскай эканамічнай камісіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый правялі трэці агляд выніковасці экалагічнай дзейнасці Беларусі (АВЭД Беларусі), вынікі якога былі зацверджаны на 21-ай сесіі Камітэта па экалагічнай палітыцы ЕЭК ААН у кастрычніку 2015 года ў Жэневе. Гэты дакумент з'яўляецца інструментам прасоўвання нацыянальнай прыродаахоўнай палітыкі, дазваляе не толькі акрэсліць шэраг праблем у гэтай сферы, але заахвоціць для іх вырашэння экспертаў і спонсараў. Эксперты даюць рэкамендацыі, якім чынам развіваць эканоміку без шкоды навакольнаму асяроддзю. Па выніках трэцяга АВЭД Беларусі высвілася, што наша краіна выканала рэкамендацыі другога агляду больш чым на 80%.**




Фота Кастуся ДРОБАВА.

— Экалагічная палітыка з'яўляецца складнікам нацыянальнай бяспекі, — пракаментаваў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.** — Менавіта таму беражлівыя адносіны да рэсурсаў, гарманічнае развіццё эканомікі ў спалучэнні з захаваннем прыроды стала напрамкам развіцця, які Беларусь выбрала для сябе.

Таксама прэм'ер-міністр адзначыў, што Беларусь можа прапаноўваць свае напрацоўкі міжнароднай супольнасці. Так, наша краіна стала першай сярод удзельніц СНД, якая ўкараніла прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў. Сярод іншых дасягненняў — распрацавана сістэма мер па развіцці «зялёнай» эканомікі, курс на якую падтрымаў Прэзідэнт.

— Цяпер перад намі стаяць наступныя задачы: па-першае, трэба ўкараніць устойлівыя мадэлі вытворчасці і спажывання ва ўсіх галінах эканомікі. Па-другое, неабходна перайсці да «зялёных» закупак — далейшае нерацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў недапушчальнае. Па-трэцяе, мы мусім развіваць і ўкараняць інавацыйныя тэхналогіі, — падсумаваў Андрэй Кабякоў.

Таксама ён падкрэсліў, што для Беларусі вельмі важная аб'ектыўная ацэнка замежных экспертаў і іх бачанне перспектыў развіцця дзяржавы. АВЭД павышае статус краіны на міжнароднай арэне.

— Агляд дае пазітыўны сігнал аб тым, што Беларусь з'яўляецца адной з краін, якія найбольш адказна ставяцца да выканання рэкамендацый, — рэзюмаваў **выканаўчы сакратар ЕЭК ААН Крысціян Фрыіс БАХ.** — Гэта сведчыць аб тым, што краіна гатова змяняцца і прыслухоўвацца да меркавання спецыялістаў і такім чынам стварае спрыяльныя ўмовы для прыцягнення фінансавых сродкаў. Спадзяюся, што агляд дапамога пры распрацоўцы плана сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі для дасягнення мэт устойлівага развіцця.

**Кацярына РАДЗЮК.**

■ Знешняя палітыка

# АДСТАЯЦЬ СВАЕ ІНТАРЭСЫ

## Прэс-сакратар МЗС пра спрашчэнне візавага рэжыму, рабства і бізнес-форум у Іспаніі

**«Мы хочам аблегчыць візавы рэжым для тых, хто жадае прыехаць у нашу краіну», — пра гэта падчас учарашняга брыфінгу заявіў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК, адказваючы на пытанні журналістаў.**

### ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД НЕЛЕГАЛЬНАЙ МІГРАЦЫІ

— Мы ўзгадняем дакладны, вычарпальны пералік краін, на грамадзян якіх будзе распаўсюджвацца новы льготны рэжым, вызначаем умовы спрошчаных паездак, — праінфармаваў прадстаўнік дыпламатычнага ведамства.

Дзмітрый Міронічык звярнуў увагу на тое, што дакумент вельмі старанна адпрацоўваецца.

— Мы не павінны дапусціць таго, каб лібералізацыя візавага рэжыму прывяла да зніжэння ўзроўню стабільнасці і бяспекі ў нашай краіне, — патлумачыў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў. — Акрамя таго, мы не павінны дапусціць нелегальнай міграцыі. Гэта сур'ёзная праблема на нашым кантыненце. Па-мойму, гэта ўжо відавочна.

Прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства звярнуў увагу і на тое, што працэс аблягчэння візавага рэжыму з беларускага боку ажыццяўляецца досыць даўно.

— Напрыклад, калі крытыкуюць кошт беларускіх віз, то чамусьці забываюць, што грамадзяне Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы атрымліваюць візы зусім за іншыя грошы, — нагадаў дыпламат. — Там, па-мойму, кошт візы складае 25 еўра. І гэта было аднабаковае рашэнне беларускага боку, прынятае вельмі даўно, ужо звыш дзесяцігоддзя таму, задоўга да таго, як нам пачалі расказваць пра шэнгенскія візы па 35 еўра.

Што да пагаднення з Еўрасаюзам аб візавым рэжыме, то, па словах Дзмітрыя Міронічыка, праца над ім ідзе. Цяпер яна знаходзіцца на этапе «адстойвання інтарэсаў беларускіх грамадзян».

### АДКУЛЬ У НАС 44 ТЫСЯЧЫ... НЯВОЛЬНІКАЎ?

Аўстралійская арганізацыя Walk Free Foundation нядаўна абнародавала даклад пра сітуацыю з нявольніцтвам у краінах свету. Згодна з гэтым дакладам, у нашай краіне налічваецца... 44 тысячы 600 рабоў. Каментуючы гэтую інфармацыю для журналістаў, прадстаўнік МЗС назваў яе пацешнай.

— Першае пытанне, якое паўстае: гэтыя людзі (складальнікі даклада. — **Аўт.**) у Беларусі былі? А калі былі, то на якім «нявольніцкім рынку» яны лічылі «рабоў» па галовах?

Дзмітрый Міронічык звярнуў увагу на тое, з якой дакладнасцю ўказана колькасць нявольнікаў у кожнай з краін.

— Падобная дакладнасць дапускае наяўнасць ледзь не паіменных спісаў, — сказаў прэс-сакратар МЗС. — Адразу, напэўна, трэба дамагацца вызвалення, калі ведаеш, што іх 400, па галовах. Гэта ж (рабства. — **Аўт.**) паўсюль злачынства...

Прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства звярнуў увагу на той факт, што ацэнкай сітуацыі з рабствам займаецца спецыяльны дакладчык Савета ААН па правах чалавека па сучасных формах рабства.

— Мы з гэтым спецыяльным дакладчыкам вельмі канструктыўна ўзаемадзейнічаем, — заявіў ён. — Беларусь дакладна выконвае свае абавязацельствы па канвенцыях аб барацьбе з рабствам 1926-га, калі не памыляюся, і 1956-га гадоў і ні разу, падкрэслю, ні разу наша краіна не падвяргалася крытыцы за іх невыкананне.

### ІСПАНСКІЯ БІЗНЕСМЕНЫ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

Падчас брыфінгу прэс-сакратар дыпламатычнага ведамства паведаміў, што гэтымі днямі — 2 і 3 чэрвеня — у Мадрыдзе, сталіцы Іспаніі, праходзіць арганізаваны Пасольствам Беларусі ў Францыі другі беларуска-іспанскі бізнес-форум. Па словах дыпламата, з іспанскага боку ў мерапрыемстве прымаюць удзел больш за 20 кампаній.

— Сярод іх лідары іспанскага рынку ў такіх сектарах, як аднаўляльная энергетыка, новыя тэхналогіі, лагістыка, вытворчасць абсталявання для аэрапортаў і авіяцыйных трэнажораў, рэалізацыя інфраструктурных праектаў у галіне аховы здароўя, дарожнага будаўніцтва, абыходжання з адходамі, ачыстткі глебы і вады, — пералічыў прадстаўнік МЗС. — У рамках бізнес-форуму для іспанскіх дзелавых колаў адбудзецца прэзентацыя магчымасцяў гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Беларуссю. Іспанскія бізнесмены будуць праінфармаваны аб інвестыцыйным клімаце і прававых умовах, якія рэгулююць дзейнасць замежных кампаній і інвестараў у нашай краіне.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Перспектыва

# Сталіца можа шмат

**На думку намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Наталлі КАЧАНАВАЙ, патэнцыял Мінска дае магчымасць выканаць даведзеныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пра гэта яна заявіла на пасяджэнні Мінгарвыканкама «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці за студзень-красавік 2016 года».**

«Кіраўнікі адміністрацый горада і кіраўнікі прадпрыемстваў павінны выразна ўсведамляць меру сваёй адказнасці, бо выкананне прагнозных паказчыкаў з'яўляецца асноўнай задачай. У Мінска ёсць патэнцыял і ўсе магчымасці быць у ліку лідараў па выкананні даведзеных заданняў», — сказала Наталля Качанава.

У сваю чаргу **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ** падкрэсліў, што патрабаванне за выкананне паказчыкаў па валавым рэгіянальным прадукце (ВРП) будуць узмоцнены. Перад кадрамі пастаўлена задача актывізаваць работу па ўсіх напрамках дзейнасці. Так, за студзень-красавік гэтага года ВРП Мінска склаўся ў аб'ёме 80,3 трыльёна беларускіх рублёў з тэмпам росту 98,1% і дынамікай росту да першага квартала на 0,6%. Доля сталіцы перавысіла чвэрць (27,4%) у фарміраванні валавога ўнутранага прадукту рэспублікі, паведамляе БЕЛТА.

Станоўчы ўклад у фарміраванне ВРП горада пераважна ўнеслі такія віды эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, як інфармацыя і сувязь, фінансавая і страхавая дзейнасць, транспартная дзейнасць, складзіраванне, паштовая і кур'ерская дзейнасць, адукацыя, ахова здароўя і сацыяльныя паслугі, паведамляе БЕЛТА. Асноўны адмоўны ўплыў на ВРП аказалі аптовы і рознічны гандаль, паслугі па рамонце аўтамабіляў і матацыклаў, апрацоўчая прамысловасць і будаўніцтва.

■ Крок за крокам

# ДАСЯГНУТЫ ПЭЎНЫ ПРАГРЭС

**Крыху больш як год таму была ўхвалена заяўка Беларусі на яе ўключэнне ў Балонскі працэс. Але ўмовай уваходжання ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі з'яўляецца выкананне дарожнай карты. Наколькі далёка прасунулася беларуская сістэма вышэйшай адукацыі ў яе рэалізацыі, што зроблена для забеспячэння мабільнасці студэнтаў, развіцця студэнцкага самакіравання, акадэмічнай незалежнасці ўніверсітэтаў і павышэння якасці адукацыі? Гэтыя і многія іншыя пытанні абмяркоўваліся падчас сустрэчы прадстаўнікоў органаў кіравання адукацыяй, беларускіх ВНУ з членамі кансультацыйнай групы па падтрымцы беларускай дарожнай карты, якая адбылася ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай адукацыі БДУ. У Мінск прыехалі эксперты з Францыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Ватыкана і іншых краін.**

— Беларуская вышэйшая школа традыцыйна моцная прыродазнаўчымі навукамі і даследчай працай, якая тут праводзіцца, — падзяліўся з журналістамі сваім бачаннем сітуацыі **кіраўнік дэпартамента па адукацыі Савета Еўропы Шур БЕРГАН.** — Беларусь мае такую ж перадгісторыю, як і некаторыя іншыя ўдзельнікі Балонскага працэсу. Гэтыя краіны маюць савецкую спадчыну, у якой ёсць як свае плюсы, так і недахопы. У Беларусі, у прыватнасці, вельмі таленавітыя студэнты. Мне здаецца, што варта надаваць большую ўвагу развіццю крытычнага мыслення.

Еўрапейскіх экспертаў цікавілі, напрыклад, перспектывы ўкаранення ў беларускіх ВНУ крэдытнай сістэмы (ECTS), якая з'яўляецца галоўным інструментам акадэмічнай мабільнасці студэнтаў. Ці ёсць у планах міністэрства намер даць універсітэтам большыя паўнамоцтвы ў вызначэнні сваёй адукацыйнай палітыкі? Якія магчымасці ў студэнтаў аб'ядноўвацца ў асацыяцыі, каб уплываць на працэсы, што адбываюцца ва ўніверсітэтах, у тым ліку і на якасць адукацыі?.. У Беларусі якасць адукацыі кантралюе дэпартамент, які падпарадкоўваецца Міністэрству адукацыі, у той час як у Еўропе для гэтых мэт створана ўжо 30 незалежных агенцтваў.

**Першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ** расказаў, што ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі будзе замацавана шматступеньчатасць вышэйшай школы (бакалаўрыят, магістратура, аспірантура, дактарантура), а таксама магчымасць для арганізацыі новых формаў адукацыйнага працэсу, такіх як дыстанцыйнае навучанне і сеткавае ўзаемадзеянне. Распрацоўваюцца крытэрыі да магістарскіх праграм.

Вадзім Богуш падкрэсліў, што ў пытанні незалежнасці універсітэтаў быў дасягнуты пэўны прагрэс. Так, напрыклад, было вырашана адмовіцца ад тыпавой вучэбна-праграмнай дакументацыі на карысць прыкладной. Пашыраны, на думку намесніка міністра, і паўнамоцтвы студэнтаў.

«Еўрапейскія эксперты пазітыўна ацэньваюць сістэму размеркавання выпускнікоў ВНУ Беларусі, — дадаў Вадзім Богуш. — Больш за тое, яны кажуць аб тым, што прадастаўленне выпускніку ўніверсітэта першага працоўнага месца — вельмі важная задача для ўніверсітэта».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

■ Падрабязнасці

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗМА ЦІ ЯКАСЦЬ ПРЭПАРАТА?

## Першыя высновы па факце смерці дзяўчынкі ў Гродне

**Камісія Міністэрства аховы здароўя, створаная для праверкі ўсіх абставін трагедыі са смерцю дзяўчынкі ў Гродне, зрабіла першыя высновы. Вакцына ў той дзень была ўведзена не толькі загінулай дзяўчынцы, але і яшчэ дзевяці дзецям. Усе яны адчуваюць сябе добра, ніякіх пабочных эфектаў у іх не з'явілася. Акрамя таго, вакцына з той самай ампулы, разлічанай на дзве дозы, была ўколатая таксама аднагадоваму дзіцяці, у якога цяпер няма ніякіх негатыўных рэакцый на прэпарат, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік камісіі Міністэрства аховы здароўя па гэтым выпадку дадаў, што падобная вакцына і раней уводзілася дзяўчынцы, бо вакцынацыя праводзілася ў два этапы, і ў першы раз у яе была нармальная рэакцыя на прэпарат. Што тычыцца медыкаў гродзенскай паліклінікі, то іх дзеянні вывучаюцца. Камісія высветліла, што ў дзень вакцынацыі медработнікі паліклінікі праверылі стан дзіцяці і не знайшлі ў яе супрацьпаказанняў для працэдуры. Акрамя таго, у кабінеце было ўсё неабходнае для аказання першай дапамогі пры ўскладненнях.

Следчы камітэт па Гродзенскай вобласці распачаў крымінальную справу па факце неналежнага выканання службовых абавязкаў медработнікамі. Быў праведзены агляд месца здарэння і прызначаны медыцынскія і судовыя экспертызы. Апытваюцца супрацоўнікі паліклінікі і работнікі брыгады хуткай дапамогі. Меры стрымання да медработнікаў не ўжываліся. Папярэдне Следчы камітэт паведаміў, што вакцына, уведзеная загінулай дзяўчынцы, была вытворчасці Бельгіі і закуплялася цэнтралізавана. Такую вакцыну выкарыстоўвалі ў Беларусі з 2014 года. Усе акалічнасці справы будуць старанна правераны кампетэнтнымі органамі. Следству яшчэ трэба высветліць, што стала прычынай трагічнага інцыдэнту: індывідуальныя асаблівасці арганізма дзіцяці або якасць прэпарата.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ СЛУЖАЧЫЯ ЗДАДУЦЬ НАРМАТЫВЫ

**У Полацкім раёне ўпершыню пройдзе спартакіяда сярод кіруючых работнікаў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. Сярод удзельнікаў планує быць і кіраўнік раённай вертыкалі выканаўчай улады. Ён узначаліць каманду.**

— Спартыўнае мерапрыемства адбудзецца 4 чэрвеня на гарадскім стадыёне «Спартак». Адказныя асобы на асабістым прыкладзе пакажуць калегам, што спорт не толькі ўмацоўвае здароўе і развівае фізічныя здольнасці. Ён умацоўвае і духоўныя сілы, развівае характар і волю, — паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Полацкага райвыканкама. — А ўсе гэтыя якасці вельмі неабходныя ў напружанай працы.

Удзел у спартакіядзе, як справядліва адзначаюць арганізатары, можа паспрыяць фарміраванню адзінства каманднага і калектыўнага духу. Праграма насычаная. Пройдуць спаборніцтвы ў розных відах спорту: дартс, стральба з вінтоўкі, армрэслінг, гіравы... Кіраўнікі згуляюць і ў шашкі, шахматы, пакажуць клас у кіданні гранаты. Усяго можна будзе праявіць сябе ў 20 відах спорту і фізічных нагрузак.

А кульмінацыяй мерапрыемства стане здача нарматываў. Яны вядомыя з праграмы фізкультурнай падрыхтоўкі «Гатовы да працы і абароны». Пераможцы атрымаюць медалі, дыпломы і сертыфікаты. Пасля гэтай спартакіяды плануецца правесці аналагічныя ў кожнай арганізацыі, на прадпрыемстве і ва ўстанове раёна.

**Карына МЯЛЕШКА.**

■ Надвор'е

# Балтыка «прышле» дажджы

## У НЯДЗЕЛЮ ЧАКАЕЦЦА ТОЛЬКІ 15—21 ЦЯПЛА

**Менавіта ў гэтыя выхадныя павінна істотна пасвяжэць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

У пятніцу, па-ранейшаму будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску. Захаваецца цёплае надвор'е, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 20—26 градусаў. А вось у суботу наша краіна трапіць пад уплыў атмасфернага фронту, які рухаецца з поўначы Еўропы. Таму ўначы месцамі па паўночнай палове, а ўдзень на большай часткі тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы тэмпература паветра будзе трымацца ў межах 7—14 цяпла, а ўдзень сонейка нагрэе паветра да плюс 20—27 градусаў.

Сапраўдны пералом адбудзецца ў нядзелю, калі ўслед за франтамі паветра з Балтыкі прынясе ў Беларусь кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы на нядзелю — 7—14 цяпла, па поўначы — нават да плюс 5-6 градусаў. Больш істотна пахаладае ўдзень, калі чакаецца 15—21 цяпла. Толькі на поўдні будзе на некалькі градусаў цяплей.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня стане яшчэ свяжэй. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад 3 да 9 цяпла, а ўдзень чакаецца ад плюс 14 да плюс 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЛЕПШЫ ЦЫГАНСКІ ДЗЕНЬ



**Лепшым днём на міжнародным фестывалі нацыянальных культур у Гродне стане той, калі на сцэне будуць запальваць «Ягоры» — удзельнікі цыганскага калектыву з Жыткавіч «Лачшо дывес». Менавіта таму, што мудрагелістая назва ансамбля з цыганскай мовы перакладаецца як «лепшы дзень». А «ягоры», дарэчы, азначае «агеньчык».**

Кіруе цыганскімі музыкамі беларус Вячаслаў Еўлаш. Цяпер ён праводзіць апошнія рэпетыцыі і настройвае жыткаўчан на перамогу. Між тым, у Гродне калектыў цыган ужо быў і прывозіў адтуль ганаровыя ўзнагароды.

Аднак справа ў тым, кажа **дырэктар Жыткавіцкага гарадскога цэнтра культуры Тацццяна ЕЎЛАШ**, што за дзевяць гадоў ансамбль некалькі разоў мяняў склад. Прыгожых жыткавіцкіх цыганачак, якія пачынаюць гастраляваць па суседніх гарадах і вёсках, хутка заўважаюць гарачыя чарнявыя хлопцы. І робяць ім прапанову, ад якой тыя адмовіцца ніяк не могуць. Каханне кіруе светам, але ж на змену тым, хто стварыў сям'ю, падрастаюць маладзейшыя і не менш таленавітыя. Часцяком у ансамбль новыя кадры пастаўляе той жа род, у якім ужо былі артысты.

Вось і цяпер чацвёра ўдзельнікаў маюць прозвішча Базылевіч: Аляксандр, Надзея, Зарына і Фаціма. Яшчэ двое — Янкевічы: брат з сястрой Тацццяна і Пётр. Ну і для разнастайнасці разам з усімі танцуюць і спяваюць Ілона Езэпчук і Генадзь Стаяновіч.

Артысты прымуць удзел у складзе дэлегацыі ад Гомельшчыны. Яны выйшлі ў фінал абласнога тура фестывалю і цяпер будуць скараць сэрцы шматлікіх гледачоў у Гродне. Дарэчы, у Жыткавічах ёсць з каго выбіраць «у артысты», бо ў райцэнтры і вакол яго сёння жыве вялікая колькасць цыганоў. Яны даўно не ў табары: маюць уласныя кватэры і ўжо імкнуцца даваць адукацыю сваім дзецям. Ва ўсякім разе Тацццяна Аляксандраўна адзначае, што калі раней дзяўчаты заканчвалі не больш за шэсць класаў да замужжа, сёння — усе дзевяць. Многія, у тым ліку дзяўчаты, працягваюць адукацыю ў ліцэі:

— Сённяшнія нашы салісткі вучацца ў школе. Толькі што закончылі дзявяты клас. Іх пакуль замуж не схапілі. Нам ніколі не было сорамна за нашых цыганоў. Касцюмы мы ім прыгожыя пашылі. Канцэрты нашага ансамбля праходзяць на ўра. Яго ўсе ведаюць і з задавальненнем слухаюць. Нашы артысты, канешне, выконваюць традыцыйныя цыганскія танцы і песні. Але ж з задавальненнем спяваюць і вядомыя творы сучасных кампазітараў. На конкурсе ёсць магчымасць праспяваць толькі адну песню, а вось на падворках нашы музыкі будуць выконваць бадай што ўвесь свой разнастайны рэпертуар!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# ТРАЎМАТОЛАГ, ЯКІ... СПЯВАЕ



**У Гродна на XI рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур з Віцебшчыны запрошаны і Шухрат Саідаў. «Пуцёўка» ў Гродна — узнагарода за ўдалае выступленне на леташнім фэсце «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю». Шухрат — студэнт Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта. Прыехаў вучыцца з далёкай Туркменіі. Цікава, што бабуля маладога чалавека — беларуска.**

— На сваёй радзіме — у Магілёве яна пазнаёмілася з салдатам, які служыў у пажарнай частцы. І пераехала жыць у Сярэднюю Азію. Дзед, дарэчы, — напалову ўзбек і татарын. У Магілёве і сёння жыве бабулін брат. Яму каля 80. Так, з задавальненнем яго наведваю... Менавіта блізкасць нашай інтэрнацыянальнай сям'і да Беларусі, якую лічу і маёй краінай, беларускія карані і вызначылі месца маёй вучобы, — расказвае будучы медык.

У сям'і ён першы будзе ўрачом. Вучыцца на 4 курсе — на лячэбным факультэце. Хоча стаць траўматолагам, рабіць аперацыі. 20-гадовы суразмоўца падкупіў сваёй ветлівасцю, шчырасцю.

— Я да вучобы ў Віцебску з адзнакай скончыў школу з паглыбленым вывучэннем рускай мовы ў горадзе Дашагуз (сёлета горад носіць тытул культурнай сталіцы Садружнасці Незалежных Дзяржаў. — **Аўт.**). Шчыра прызнаюся, што спачатку вучоба тут давалася цяжкавата. І зусім не з-за праблем з рускай мовай, а з-за хіміі. У школе вельмі любіў гэты прадмет, як і біялогію. Але хутка зразумеў, што глыбіня вывучэння адрозніваецца ў «альма-матар», — прызнаецца студэнт.

Ён вельмі мэтанакіраваны чалавек, таму хімія ў ВНУ яму «пакарылася». Яго прынцып па жыцці: калі нешта рабіць, дык толькі на выдатна.

Ва ўніверсітэце вучыцца і яго дзяўчына Алена Калядэнка. Вырашыла, што будзе педыятрам, бо вельмі любіць дзяцей. Шухрат прасіў абавязкова напісаць пра яе. Пажартаваў, што хоць яна і бландзінка, але разумная, што рэдкасць для прыгажунь.

— Пазнаёміліся больш за год таму. Адбылося гэта ў спартыўнай зале ў інтэрнаце. Яна любіць гуляць у настольны тэніс. А я бодзібілдынгам захапляюся. Спачатку сябравалі, а потым, як кажуць, раптам «іскра ўзнікла». Ва ўсіх цяжкіх сітуацыях яна мяне падтрымлівае, надзейны мой сябар, — пяшчотна распавядае ён пра дзяўчыну.

Шухрат з сям'і, дзе шмат талентаў. Яго маці і цётка ў музычнай школе навучыліся іграць на фартэпіяна. Дзед іграе на гармоніку, дзядзька — на гітары, а бабуля спявае.

— У выніку так атрымалася, што я таксама пайшоў вучыцца ў музычную школу па класе «акардэон і харавыя спевы». А да гэтага 4 гады гуляў у клубе ў футбол. Вельмі люблю гэты від спорту. Але мастацтва, можна так сказаць, перамагло, — расказаў суразмоўца.

Ён у Віцебску ўпершыню прадэманстраваў свой талент у пачатку вучобы — на міжнародным фестывалі «Студэнцкая восень ВДМУ». Праспяваў на туркменскай мове пра студэнтаў, якія вучацца за мяжой. Прапанавалі зрабіць гэта і ў наступным годзе. Выступаў і на Наўруз-байраме (свята Новага года па мусульманскім календары) у Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Цяпер ён — «зорка» гэтых культурных акцый.

У Гродне плануе выканаць песню на ўзбекскай мове. Пасля гэтага запрасілі выступіць і ў Віцебску на плошчы Перамогі — на гарадскім свяце.

Можа, «перакваліфікуецца» ў творчыя людзі? Сярод апошніх, дарэчы, нямала прафесійных медыкаў. У прыватнасці, зорка КВЗ, акцёр, сцэнарыст, прадзюсар Гарык Марцірасян скончыў Ерэванскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт па спецыяльнасці неўрапатолаг-псіхатэрапеўт. Ветэран КВЗ, рэжысёр Юлій Гусман — выпускнік лячэбнага факультэта Азербайджанскага медыцынскага інстытута і аспірантуры. А хто не любіць песні ўрача «хуткай» Аляксандра Разенбаўма?

Шухрат пакуль што настроены скончыць універсітэт, лячыць. А потым, гаворыць, як жыццё падкажа. Можа, гэта публікацыя стане першай у мностве іншых гутарак з вядомым артыстам Шухратам Саідавым? У любым выпадку шчыра жадаю хлопцу ўдачы ва ўсіх пачынаннях!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# АРЭНДА НА МІНІМУМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднапакаёвыя кватэры з цэннікам ад 180 да 230 долараў прадугледжваюць ужо даволі якасныя апартаменты з больш дарагой мэбляй, поўным наборам бытавой тэхнікі (сучасны халадзільнік і тэлевізар, а таксама абавязкова пральная машына) і ліквідным месцазнаходжаннем (недалёка ад лініі метро, побач са знакавымі гандлёвымі цэнтрамі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі.

**«Аднапакаёвыя кватэры з цэннікам ад 180 да 230 долараў прадугледжваюць ужо даволі якасныя апартаменты з больш дарагой мэбляй, поўным наборам бытавой тэхнікі».**

Наш пастаянны эксперт паведамляе, што сёння рынак арэнды працягвае функцыянаваць у штатным рэжыме і «паміраць» у найбліжэйшы час не збіраецца, як раней тое прадракалі асобныя спецыялісты. З рынку цалкам знікла нервовасць з боку бескватэрных кліентаў, якія сталі больш адукаванымі ў пытаннях арэнды, а таму і больш спакойнымі. І гэта сёння не дзіўна, бо колькасць варыянтаў прапановы прыкладна ў тры разы перавышае сённяшні попыт.

## Ужо ёсць двухпакаёўкі да 200 долараў

Мінімальны цэннік самых слабенькіх па якасці двухпакаёвых кватэр цяпер складае ад 180 да 200 долараў. Такі тарыф арэнды звычайна маюць маленькія кватэры з агульнай плошчай ад 40 да 45 квадратных метраў, якія маюць «прапіску» ў бюджэтных панэльных дамах Заводскага раёна ці ў Шабанах. У большасці выпадкаў гэта «хрушчоўкі» з сумесным санвузлом і нават прахаднымі пакоямі. Такіх кватэр на рынку не вельмі шмат, але некалькі варыянтаў заўсёды існуе.

Самая распаўсюджаная прапанова на рынку арэнды Мінска прыпадае на варыянты двухпакаёвых кватэр з сярэднім цэннікам — у межах ад 200 да 250 долараў. Выбар па такім цэнніку будзе сапраўды вялікі, аднак Алена Агрызка нагадвае, што за падобныя грошы кліентам прапануюць толькі жыллё эканомкласа. Больш якасныя апартаменты або жыллё ў дамах, якія бліжэй да цэнтра, будуць каштаваць ужо не менш за 300 долараў у месяц.

Даволі значна рынак прасеў сёлета і па шматпакаёвых кватэрах. У новабудоўлях не вельмі вялікія па плошчы трохпакаёвыя кватэры без мэблі сёння магчыма зняць за 200-250 долараў. Сярэдні кошт стандартных трохпакаёвак з поўным наборам мэблі і тэхнікі складае ўжо ад 300 долараў і вышэй.

## Прапанова якаснага жылля памяншаецца

Вельмі працяглае і істотнае патаненне ўсіх відаў арэнднага жылля пачало карэктаваць тэндэнцыі на рынку па змяненні балансу ў структуры попыту і прапановы. Сёння гаспадары жылля, дзе быў праведзены сапраўды дарагі рамонт (паркет, сучасная кухня, імпартная сантэхніка і шпалеры) пачынаюць здымаць свае кватэры з арэнды. Падобныя дзеянні ўласнікаў цалкам зразумелыя, бо попыт на дарагое жыллё адсутнічае, а здаваць падобныя «кватэры-лялькі» за 200-300 долараў нейкім кватарантам без адпаведнага статусу проста страшнавата.

Толькі за апошнія чатыры месяцы ў сталічных агенцтвах існавала некалькі выпадкаў, калі ў падобных кватэрах «нечакана» ламалася сантэхніка ці дарагая мэбля, а падобныя нюансы ў дагаворы арэнды былі прапісаны павярхоўна. У агучаных выпадках па сапраўды якасным жыллі павінен працаваць механізм закладу, які не вяртаецца пры ўзнікненні спрэчных момантаў наконт псавання кватэры. Аднак у сітуацыі мінімальнага попыту на арэнднае жыллё гэтым механізмам закладу карыстаюцца толькі адзінкі. Тут будучыя кватаранты проста шукаюць іншыя варыянты, дзе адсутнічае падобная опцыя.

Менавіта ў апошнія месяцы знізіліся тарыфы арэнды і па катэгорыі VIP-кватэр. Сапраўды элітныя аднапакаёвыя кватэры цяпер здаюцца ўжо ад 400 долараў за месяц. Цэннік двухпакаёўкі такога класа пачынаецца ўжо ад 450-500 долараў. Мінімальная арэнда VIP-шматпакаёвак будзе ўжо ад 500 долараў і вышэй.

## Мінімальны цэннік стане масавым

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў нашага эксперта, прыкладна да сярэдзіны ліпеня цэны на арэнду стандартнага жылля працягнуць заставацца на мінімальным узроўні. Спадарыня Алена лічыць, што практычна па ўсіх аднапакаёвых кватэрах сярэдняй якасці ў спальных раёнах Мінска стаўка арэнды будзе вагацца ў межах ад 150 да 200 долараў. Ужо цяпер гаспадары такога жылля зразумелі, што па кошце больш за 200 долараў падобнае жыллё ўвогуле амаль не здаецца. Таму зніжэння мінімальных ставак спецыялісты не чакаюць, а вось незаслужана павялічаныя цэннікі арэнды звычайнага жылля будуць і надалей карэктавацца ў бок зніжэння.

**«З дзяржаўнага арэнднага фонду чаргавікам прапануюць камерцыйнае жыллё па цане ад 60 да 150 долараў у месяц за кватэру ў залежнасці ад колькасці пакояў».**

Паводле прагнозаў Алены Агрызкі, фарміраванне гэтага мінімальнага масавага цэнніка працягнецца да трэцяй дэкады ліпеня. А потым прыйдзе час іншагародніх «зялёнай» моладзі, калі ў сталіцы будзе шмат абітурыентаў. Частка з іх (у каго дастаткова балаў для паступлення) разам з бацькамі пачне шукаць здымнае жыллё.

## Ажыятажу не будзе, але цэннікі могуць вагацца

Месяцаў цяпер у сталічных інтэрнатах быццам і хапае, але асобным катэгорыям маладых падобнае калектыўнае пражыванне не зусім даспадобы. Кампаньёнствам як інструментам эканоміць грошы кліенты з перыферыі ў першы год вучобы амаль не карыстаюцца. Потым, менавіта ў першую дэкаду жніўня, на другасным рынку арэнды сталічнага жылля максімум прапановы яшчэ захаваецца, аднак цэны на здымнае жыллё памяншацца ўжо не будуць, бо попыт пачне павялічвацца.

З другой паловы жніўня і ажно да сярэдзіны верасня ў сталіцы чакаецца традыцыйнае павелічэнне актыўнасці патэнцыяльных кватарантаў. Здымныя кватэры пачнуць шукаць не толькі студэнты, але і новыя маладыя спецыялісты, якія вырашаць застацца ў Мінску. Верагодна, што ў гэты перыяд цэннікі на стандартнае і бюджэтнае арэнднае жыллё могуць крыху павялічыцца ў параўнанні з мінімальнымі ў чэрвені і ліпені.

## Камерцыйнае жыллё пакуль яшчэ таннейшае

У другой палове мая на сайты Першамайскага і Фрунзенскага раёнаў Мінска трапіла інфармацыя для чаргавікоў, якім прапаноўвалася арэнда кватэр дзяржаўнага камерцыйнага фонду. У Першамайскім раёне прапануецца недарагая арэнда (каля 600 тысяч за маленькую трохпакаёўку), але толькі для сям'і ў складзе не менш за 4 чалавекі, а выдаецца такое жыллё спецыялісту на час службы.

У адміністрацыі Фрунзенскага раёна арэнднае жыллё прапануюць ужо і звычайным чаргавікам, але плата за карыстанне жылымі памяшканнямі тут крыху іншая. Напрыклад, цяпер прапануецца адразу каля 20 кватэр. Мінімальны цэннік такой аднапакаёвай кватэры (каля 35 «квадратаў») складае 1 млн 170 тысяч рублёў без уліку платы за камунальныя паслугі. Максімальны кошт арэнды трохпакаёвай кватэры з агульнай плошчай каля 61 квадратнага метра складае ўжо 3,1 млн рублёў. Атрымліваецца, што з дзяржаўнага арэнднага фонду чаргавікам прапануюць камерцыйнае жыллё па цане ад 60 да 150 долараў у месяц за кватэру ў залежнасці ад колькасці пакояў.

Існуе ў Фрунзенскім раёне каля дзесятка кватэр для першачаргавікоў з ліку суддзяў і пракурорскіх работнікаў, маладых спецыялістаў, работнікаў пры прызначэнні на пасаду ў выпадку іх пераезду з іншага населенага пункта ў Мінск. У гэтым выпадку кошт карыстання адна- і двухпакаёвымі кватэрамі будзе вагацца ад 270 тысяч да 480 тысяч рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

TV@R



## Ганна ЭЙСМАНТ:

# «НІКОЛІ НЕ МАРЫЛА БЫЦЬ ВЯДУЧАЙ»

**Ганна адна з першых дзяўчат, хто з'явіўся на экране беларускага тэлебачання ў спартыўнай журналістыцы. Яна разбіраецца ў спорце не горш за самага заўзятага балельшчыка, з лёгкасцю расказвае як пра мастацкую гімнастыку, так і пра футбол. Сёння дзяўчына з'яўляецца вядучай, аўтарам шматлікіх фільмаў і перадач, а яшчэ выхоўвае маленькую дачку Іванку, імя якой, дарэчы, таксама звязана са спортам. Пра тое, як прайшоў першы прамы эфір, чаму сама Эйсмант доўгі час ігнаравала заняткі спортам і пра сваю новую праграму Ганна расказала карэспандэнту «Звязды».**

— Дарэчы, адным з фактараў таго, што мяне ўзялі вядучай спартыўных навін, было веданне беларускай мовы, — пачынае гутарку Ганна. — Трэба было не проста казаць пра спорт па-беларуску, а яшчэ і самім пісаць тэксты, але самае галоўнае, трэба было думаць на беларускай мове. У прамым эфіры можа здарыцца ўсё, што заўгодна, і перакладаць тэкст у галаве проста няма часу.

***— Да таго, як трапілі ў кадр, на тэлебачанні працавалі доўга?***

— Не, усё склалася неяк хутка. Яшчэ студэнткай я прыйшла на першы канал у ток-шоў «Будні». Адна з тэм там гучала так: «Дзе цяпер беларускі футбол?» Я вырашыла ўзяцца за яе, у мае абавязкі ўваходзіла тэлефанаваць гасцям, запрашаць каго-сьці асабіста, дамаўляцца. Потым нейкі час я проста насіла касеты, яны былі такімі вялізнымі... Пісала навіны, ездзіла на здымкі, а потым кіраўніцтва вырашыла, што ў навінах патрэбна дзяўчына, прапанавалі мне, я прайшла кастынг і трапіла ў кадр. Адразу адзначу, што вядучай быць ніколі не марыла, у першую чаргу я хацела стаць журналістам.

***— Памятаеце свой першы прамы эфір?***

— Вельмі добра памятаю! «Панараму» вёў Юрый Гроераў, гэта ўсё было на беларускай мове, ён перадаваў мне слова. Як цяпер успамінае мой брат, ён скурыў пачак цыгарэт за мой пяціхвілінны эфір. Таму што толькі ён і ведаў, я нават маме не сказала, што з'яўлюся ў тэлевізары, каб ніхто не хваляваўся.

***— Выбар спартыўнай тэматыкі быў усвядомленым ці проста так супала?***

— Спорт мне заўсёды імпанаваў, хоць пачала працаваць у журналістыцы з культуры. На «Радыё Рокс» вяла тэатральную рубрыку. Але спорт усё ж пераважыў. Мне здаецца ўсё ў нашым жыцці ідзе з сям'і, а я расла ў атмасферы, дзе спорт заўсёды любілі і цікавіліся ім. Калі з'явілася магчымасць працаваць у гэтай сферы, падумала: «Так выдатна, браты за мяне парадуюцца, я знаёмая з многімі футбалістамі, трэнерамі, мне ёсць пра што з імі пагаварыць».

***— Напэўна, спачатку сутыкаліся са стэрэатыпам, што дзяўчына не можа разбірацца ў спорце так добра, як мужчына?***

— Мяне нават мае калегі з аддзела вельмі доўга прадстаўлялі, як «вось, у нас дзяўчына тут вядучая, яна манекеншчыца». Даводзілася нагадваць: акрамя таго, што я падзарабляла манекеншчыцай, у мяне ёсць вышэйшая адукацыя журналіста і дыплом *(смяецца)*. Вядома, нейкі час я даказвала, што таксама нешта магу. Гэта падагравала ўва мне спартыўны інтарэс, каб зрабіць штосьці лепш. А потым... Ведаеце, часам тое, што ты дзяўчына, нават дапамагае, многія пытанні дзесьці вырашаюцца за кошт жаночага абаяння. Любы мужчына трошкі падтае пры выглядзе дзяўчыны, у якім бы настроі ён ні быў, шанц на інтэрв'ю ўзрастае...

***— Спартсмены выяўлялі сімпатыі?***

— Вядома, але не буду называць імёны. Лічу, гэта нармальная сітуацыя, такое можа здарацца ў любым офісе.

***— На «Беларусь 5» стаў выходзіць ваш новы праект «Жанчыны і спорт». Раскажыце пра яго.***

— Летась Нацыянальны алімпійскі камітэт запрасіў мяне і ўключыў у склад камісіі «Жанчыны і спорт». І на першым жа сходзе ў Максіма Уладзіміравіча Рыжанкова ўзнікла прапанова стварыць які-небудзь відэапраект ад камісіі. Тады гаворка яшчэ не ішла пра тэлебачанне, але пазней вырашылі, што такая праграма павінна выходзіць на «Беларусь 5» фарматам у 26 хвілін, каб за гэты час паспрабаваць раскрыць гераіню. У беларускім спорце шмат цікавых дзяўчат з унікальнымі лёсамі. Ужо выйшла праграма пра Меліціну Станюту, усе адзначаюць, што яна была там зусім іншай, здаецца, мне ўдалося яе трохі раскрыць. У наступным выпуску перад гледачамі паўстане Алена Леўчанка. Убачыўшы дзяўчат такімі, я ўпэўненая, нашы людзі будуць хварэць за іх па-іншаму.

***— За гады журналісцкай кар'еры здараліся форс-мажоры?***

— Не без гэтага. У Калумбіі, напрыклад, у мяне ўкралі камеру. Мы паехалі туды разам з нашай зборнай на чэмпіянат свету па футзале. Пасля пераможнага матчу з пазітыўнымі эмоцыямі добра адздымалі і пакінулі камеру ў раздзявальні, якая ахоўваецца. Адтуль яе і ўкралі. Мы ўсё думалі, што нас абрабуюць у гатэлі ці на вуліцы, дзе заўгодна, але не там. Выклікалі паліцыю, але для іх усё, што танней за 10 тысяч долараў, — гэта не крадзеж.

***— Які праект даўся вам найбольш складана?***

— Адназначна гэта фільм пра Руслана Салея. Там было шмат момантаў, якія проста выбівалі з раўнавагі. Па-першае сама тэма, адна справа расказваць пра спартсмена, у якога ўсё добра, жыццё якога працягваецца, і зусім іншая — казаць пра трагедыю. Па-другое, я пачала працаваць над фільмам праз паўгода пасля катастрофы, гэта вельмі малы тэрмін. І пачала працаваць толькі тады, калі на гэта дала згоду сям'я Руслана. Як сказаў нябожчык журналіст Сяргей Аляхновіч, які пісаў кнігу пра Салея і прапанаваў мне зняць фільм, сям'я пагадзілася, каб фільм рабіла менавіта я. Вядома, калі пачула такое, то зразумела, што павінна здымаць.

***— Паралельна з працай вы выхоўваеце маленькую дачку. Не баяліся сысці ў дэкрэт і выпасці з абоймы?***

— У жыцці ўсё здараецца менавіта тады, калі гэта сапраўды трэба. Калі б у мяне з'явілася дзіця ў гадоў 20-25, я б хвалявалася, а так цяжарнасць здарылася, калі я ўжо так напрацавалася... Калі даведалася, што чакаю дзіця, падумала: «Ну трэба ж, нарэшце дэкрэт!» Тым не менш я да 8 месяцаў працавала ў эфіры і рабіла праграму «Дынама Inside». Думала, што тры гады буду адпачываць, але гэта, вядома ж, не атрымалася, больш за тое, я пачала вяртацца да сваіх праектаў, калі дзіцяці было 2,5 месяца. Армія са сваякоў заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу, дзякуй ім вялікі, гэта дазваляе мне самарэалізоўвацца. У мяне да гэтага часу бываюць паўночныя мантажы, вар'яцкія здымкі на ўвесь дзень, і ўсе ставяцца да гэтага з разуменнем.

***— Дачка падобная на маму?***

— Цяпер пра гэта складана казаць, Іванка яшчэ маленькая, ёй крыху больш за два гады. Яна авен, а я рак — мы зусім розныя. Яна ў мяне дзелавая дзяўчынка, з характарам, баявая. Я ні ў якім разе не спрабую збіць з яе гэткую пыху. Іванка вельмі самастойная, у 3 месяцы ўжо сама трымала бутэлечку. Я стараюся быць для яе сяброўкай і лічу, што дзіця будзе шчаслівым тады, калі ў яго будзе шчаслівая мама, а мама шчаслівая, калі задаволена на ўсіх франтах, і ў тым ліку запатрабаваная ў працы.

***— Прыгожае і рэдкае імя — Іванка.***

— Як толькі я прыйшла працаваць у спорт, мне вельмі падабаўся італьянскі клуб «Ювентус», а там гуляў Павел Недвед. Ён далёкі ад майго ідэалу мужчыны, але як футбаліст быў мне вельмі сімпатычны. Я стала чытаць пра яго, цікавіцца яго жыццём і даведалася, што яго жонку клічуць Іванка. З таго часу мне так спадабалася гэтае імя, я падумала, што калі ў мяне будзе дачка, то яна будзе Іванка. Калі незадоўга да родаў абвясціла гэта сваякам, яны былі ў шоку, а цяпер ужо не ўяўляюць, што малую маглі зваць па-іншаму.

***— Вы тут згадалі ідэал мужчыны, які ён для вас?***

— Ён павінен быць мацнейшым за мяне, думаю, са мной няпроста, хоць бы нават з-за прафесіі. Раней мне задавалі пытанне, ці змагла б я пакінуць працу дзеля сям'і? Я ніколі яго не разумела і не адказвала на гэта, таму што заўсёды лічыла, што калі мужчына хоча, то ён будзе з той жанчынай, якая яму патрэбна, насуперак вар'яцкаму графіку, характару і мужчынскай увазе, якой я акружана, бо працую ў асноўным заўсёды сярод мужчын. Калі ён прыме гэта ўсё, значыць, ён мацнейшы за ўсіх астатніх і яму дастанецца галоўны прыз.

***— Вы выдатна выглядаеце ў кадры. Ведзяце здаровы лад жыцця?***

— Я нікому нічога не навязваю і не люблю, калі навязваюць мне, таму асабліва ніколі не задумвалася над такім ужо правільным ладам жыцця. Заўсёды ігнаравала заняткі спортам, ніякіх трэнажораў, спартзалы і гэтак далей, а нядаўна вырашыла, што ўсё ж трэба пачынаць, і стала ўдзельніцай праекта «Гандбол. Мара мая», зараз хаджу на трэніроўкі. Што тычыцца харчавання, то чыста інтуітыўна замест сасіскі з'ем кавалачак мяса ці запраўлю салату не маянэзам, а чымсьці карысным, але пры гэтым, абсалютна спакойна магу заехаць у Макдональдс і часам дазволіць сабе велізарны чызбургер. Мне здаецца, што трэба жыць ужо цяпер і лавіць задавальненне ад усяго, у тым ліку ад ежы.

А што тычыцца знешняй прыгажосці, то самае галоўнае — гэта выспацца, ну і не варта забываць, што, калі ты займаешся любімай справай, як бы гэта банальна ні гучала, атрымліваеш эмоцыі, унутранае шчасце адбіваецца і на знешнасці.

***— У Ганны Эйсмант ёсць сакрэт поспеху?***

— Сакрэт у тым, каб працаваць з жаданнем, працаваць шмат, не проста быць прыгожай вядучай, а ведаць, разбірацца ў сваёй тэме. Умець схаваць свае капрызы кудысьці далей, часам забываць пра сябе, быць гатовым ахвяраваць сваім асабістым часам. Без гэтага ніяк.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*


## «НАМ З ВАМІ ПА ДАРОЗЕ»

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2016 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 13 ЛІПЕНЯ 2016 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**







Сярод падпісчыкаў 14.07.2016 года будуць разыграны 7 двухмесных палатак Atemi і суперпрыз — веласіпед Stels Navigator 700 V 2016. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.07.2016 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2016 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» чытайце ў нумары 103 газеты «Звязда» ад 02.06.2016 года.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 07.06.2016 ПА 30.09.2016 ГОДА.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2768 ад 26.05.2016 года, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)
______________________ **на III кв. або 2-е паўг. 2016 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

Падпіска-2016

## ВАРТА ПАБАЧЫЦЦА

**Лета крочыць па Беларусі, звяздоўцы таксама працягваюць свае паездкі па краіне. Мы накіроўваемся ў самыя розныя гарады і вёскі, каб пабачыцца са сваімі чытачамі і даведацца пра адметныя навіны, што называецца, на месцы. Цікавыя і карысныя сустрэчы ўжо адбыліся ў шэрагу раёнаў.**

**Наперадзе — не менш яскравыя спатканні. Чарговая сустрэча адбудзецца на Брэстчыне — мы накіроўваемся ў Івацэвіцкі раён. Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца 3 чэрвеня з 12 да 15 гадзін на раённым вузле паштовай сувязі. Завітайце — варта пабачыцца!**




# СВЕТЛАЯ ГАЛАВА Ў БУКЛЯХ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Крамо́ла (устарэлае)** — мяцеж, бунт.

**Кухта́ль (размоўнае)** — удар кулаком. *Даць кухталя́.*

**Куса́ннік** — недаедзены кавалачак хлеба. *Я чужых кусаннікаў не ем.*

**Гары́шча** — верх, вышыня; прастора паміж столлю і дахам.

**Кума́ч** — бавоўняная тканіна яркачырвонага колеру. *Паходзіць з арабскага kumas.*

**Бу́клі (устарэлае)** — завіты кольцамі пучок валасоў. *Ад французскага boucles.*

**Светлая галава** — вельмі разумны чалавек; той, хто ясна і лагічна мысліць, разважае. *Беларускія адпаведнікі — з галавой, з царом у галаве, галава варыць. Рускія: семи пядей во лбу.*

**Не па днях, а па гадзінах** — расці, развівацца вельмі хутка. *Беларусы яшчэ скажуць: як грыбы пасля дажджу, як на дражджах. Рускія: как на дрожжах. Як прыклад — радкі з вершаванай казкі Алеся Якімовіча:*

*І на славу рос хлапчына,*
*не па днях, а па гадзінах...*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Хто лепшы?

# ЯК ЗАПАЛІЦЬ ТЭЛЕЗОРКУ

**Гэтым пытаннем задаліся ў тэлерадыёкампаніі «Гомель» і... пачалі рэалізацыю праекта «Дзіцячая гадзіна на Беларусь 4». Вядзенне перадачы па планах стваральнікаў будуць ажыццяўляць хлопчыкі і дзяўчынкі. З лютага па раёнах праходзілі рэгіянальныя адборы школьнікаў для ўдзелу ў паўфінале.**

Бацькі актыўна падтрымлівалі нашчадкаў і за кулісамі Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, дзе праходзіла яскравае шоу, арганізаванае пры падтрымцы ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама.

У паўфінал конкурсу-кастынгу «Юная тэлезорка» выйшла амаль сотня школьнікаў з усіх раёнаў Гомельшчыны. Дазволена было ўсё: спяваць, танцаваць, байкі расказваць. Да таго ж, журы задавала свае пытанні прэтэндэнтам, у тым ліку на беларускай мове. Дарэчы, высветлілася, што зусім не многія юныя яе ведаюць і любяць.

У фінал выйшлі 25 дзяцей розных узростаў. Асабліва парадавалі ўсіх школьнікі Светлагорска і Рэчыцы. Журы дапусціла ў фінал прадстаўнікоў з гэтых райцэнтраў усёй камандай. Фінал прэтэндэнтаў на тэлевядучыя адбудзецца 20 чэрвеня. Па яго выніках будуць вызначаны дзве пары (у розных узроставых катэгорыях) міс і містар тэлеканала «Беларусь-4. Гомель». Застаецца актуальнай і намінацыя сімпатый гледачоў.

Пакуль жа фіналісты-школьнікі атрымліваюць асалоду не ад пачатку канікул, а ад здымак тэлеролікаў, якія павінны дапамагчы максімальна раскрыць іх творчую асобу. Дарэчы, на фінал конкурсу ў журы запрошана кіраўніцтва тэлеканала «Беларусь 3».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by* ■

## Панядзелак, 6 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
**9.00** Навіны.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 13.05 Меладрама «Старэйшая сястра».**
**14.55 Серыял «Сваты-3». Заключная серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**16.30 Серыял «Сваты-4». 1-я серыя.**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.55** Дзень спорту.
**0.10 Меладрама «Упершыню замужам».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.15, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**10.50** Азбука густу.
**11.25** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**11.55 Серыял «Класная школа».**
**13.05** Капейка ў капейку.
**14.00** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.05 Серыял «Косці».**
**18.00 Серыял «Вароніны».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.10** КЕНО.
**22.15** Рэпарцёр.
**23.10 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.05, 18.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15 «Новы Гулівер». Казка.**
**9.20** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**10.15** «Наперад у мінулае».
**10.40, 18.20, 21.15** «Размаўляем па-беларуску».Тэлевіктарына.
**11.10** «Музеі Беларусі». Мірскі замак.
**12.20** Адэль. Каралеўскі Альберт-хол. Канцэрт.
**13.50, 21.50** «Час кіно».
**14.00 «Джамбул». Драма.**
**15.30** «Я чую, як зямля стагнала ...» Дак. фільм.
**16.05 «Глыбокая плынь». Драма.**
**17.35, 0.05** «Дыя@блог». Пра літаратуру.
**18.25** «Эфект рэнія». Дак. фільм.
**19.20 «Угрум-рака». Драма. «Громавы».**
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Няспешная вясна». Меладрама.**
**0.30** «Геапалітыка: свет за тыдзень».

### Беларусь 5

**7.20, 18.45** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Баскетбол. НБА. Фінал. Другі матч.
**9.25** Міжнародны турнір па конным спорце.
**11.30** На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**12.00, 15.30** Тэніс. Турнір WTA. Хертагенбаш.
**14.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Шахцёр» (Салігорск).
**17.35** Адзін дзень на шляху да Алімпа. Веславанне на байдарках і каноэ. Відэачасопіс.
**18.10** «Жанчыны і спорт». Алена Леўчанка.
**18.55** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. Фінал. Трэці матч. «Унікса» (Казань) — ЦСКА (Масква).
**20.45** Час футбола.
**21.25** PRO спорт. Вынікі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 «Адвароттныя адлік». «Фаня Алер. Вайна без антракту». Фільм першы.**
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Драма «У тумане».**
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Ежа багоў».
**15.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.55** «Часткі свету».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзве зоркі на СТБ». Найлепшае.
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Ваенная тайна».
**1.00 Драма «Майстар».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Серыял «Кароткае дыханне».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 5.25** «Няма праблем».
**13.45, 0.45 Маст. фільм «Прыкінься маім мужам».**
**15.30, 2.15** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. цыкл «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Дом узорнага ўтрымання».**
**19.20 Серыял «Які памнажае смутак».**
**21.05 Маст. фільм «Цётка Клава фон Гетэн».**
**22.55 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за словам».
**2.40** «Іншы свет».
**3.10** «Народы Расіі».
**4.00 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Мар'ін гай-2».**
**19.10, 20.50 Серыял «Водар шыпшыны».**
**21.55, 23.10 Серыял «На далёкай заставе».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Ты не паверыш!»
**15.00, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Выкідала».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 20.00, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.05 Серыял «Вечнасць».**
**8.15 Драма «Кандагар».**
**10.00 Серыял «Пад купалам».**
**10.45 Фантастыка «Трансформеры».**
**13.05, 16.30** «Кінабланкнот».
**13.15 Серыял «Бездань».**
**14.15, 18.20, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.45 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.30 Серыял «Складанасці».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Свой фермер. Дзённік».
**21.20 Трылер «Дваццаць адно».**
**23.15 Серыял «Торн».**

### ВТБ

**6.00, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 13.30, 17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00** «Ералаш».
**8.30** Серыял «Вароніны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Баявік «Нястрымныя 2».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00** «Лаві момант».
**18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**20.00** Серыял «Пушкін».
**21.10** Меладрама «Выпрабавальны тэрмін».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** Пушкінскі дзень Расіі. «Стрэл». Маст. фільм.
**12.30, 14.30, 17.30** «А.С. Пушкін. Тысяча радкоў пра каханне».
**12.55** «Капітанская дачка». Маст. фільм.
**15.10** «Барыс Гадуноў». Маст. фільм.
**17.55** Г. Свірыдаў. «Мяцеліца». Музычныя ілюстрацыі да аповесці А.С. Пушкіна.
**18.30** А.С. Пушкін. «Медны коннік». Чытае Міхаіл Казакоў.
**19.00, 20.45, 1.25, 2.40** Сусветныя скарбы.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**21.00** «Тым часам».
**21.50** Галасы ХХІ стагоддзя. Васіль Герэла.
**22.20** «Станцыйны наглядчык». Маст. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Энігма. Сэр Цім Сміт».
**0.35** «Іваноў». Серыял. 1-я серыя.
**1.40** «Толькі Моцарт». Канцэрт Барыса Беразоўскага і Аляксея Уткіна.

### Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2010 год.
**6.55, 7.30, 11.30, 12.45, 13.55, 14.45, 18.55, 20.30, 21.40, 23.00, 0.45, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Дзе гэта бачылі, дзе гэта чулі».
**8.00** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Жыве такі хлопец».
**12.00** «Акулы пяра». Гурт «Агата Кристи».
**13.00** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе».
**14.10** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**15.00** Маст. фільм «Маленькая Вера».
**17.05** «Філасофія лёсу».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Забароненая музыка». 2004 год.
**19.20** Маст. фільм «Ехалі мы, ехалі».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 4-я частка.
**1.00** Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**5.00, 8.30, 11.00, 14.00, 20.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Мужчыны. Фінал.
**6.30, 17.00, 23.00** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**7.30, 19.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Жанчыны. Фінал.
**9.30, 0.45** Футбол. «Дарога на еўра».
**10.00** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**12.00, 15.00, 18.15, 2.30** Тэніс. Турнір АТР.
**21.30, 1.1.5** Тэніс. «Ралан Гарос». Найлепшае.
**22.30** «Дарога да золата».
**0.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**0.15, 1.10** Футбол. Еўрагалы.
**0.20** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**2.15** Watts.

### Камедыя

**0.55** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**2.35** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**4.10** Камедыя «Ох, ужо гэты водпуск».
**5.45, 14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**6.10** Камедыя «Піжон».
**7.50** Меладрама «Справа ў табе».
**9.30** Камедыя «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**11.10** Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
**12.50** Серыял «Былыя».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Вялікі Стэн».
**17.55** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**19.30** Камедыя «Уцекачы».
**21.10** Камедыя «Двое — гэта занадта».
**23.15** Камедыя «Багіня».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30** «Доктар І...»
**8.00, 18.55, 1.50** «Падарунак лёсу». Серыял.
**9.40, 3.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.30, 4.20** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.30** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**12.25** «Без падману».
**13.15** «Рэальная казка». Фільм — дзецям.
**15.05** «Каменская». Серыял.
**16.00** «Назад у СССР». Серыял.
**17.00** «Пяць гісторый пра каханне». Дак. фільм.
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 1.05** «М.У.Р». Серыял.
**21.50** «Рэвізора».
**22.45** «Развітанне».
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**5.10** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** «Герцагіня». Драма.
**8.10, 4.35** «Сотавы». Трылер.
**9.55, 2.10** «Капітан Крук». Фэнтэзі.
**12.30** «Без кампрамісаў». Трылер.
**14.15** «Прабач за каханне». Меладрама.
**16.10** «Куды прыводзяць мары». Драма.
**20.10** «Шоўк». Меладрама.
**22.10** «Лофт». Драма.
**0.05** «Джобс: Імперыя спакусы». Драма.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Бармен».
**8.15, 2.30** Драма «Я не вярнуся».
**10.20, 4.40** Драма «І не было лепшага брата».
**12.20** Дэтэктыў «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту».
**14.00** Меладрама «Блаславіце жанчыну».
**16.20** «Пуцёўка ў жыццё». Расія, прыгоды.
**18.20** Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».
**20.20** Меладрама «На свеце жывуць харошыя і добрыя людзі».
**22.20** Дэтэктыў «Прэзумпцыя віны».
**0.20** Драма «Не хлебам адзіным».

### National Geographic

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 13.40** Гульні розуму.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 17.05, 18.40, 21.00, 0.55, 4.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**8.20, 17.50** Суперзброя Гітлера.
**9.10, 14.00, 19.30** Згубленая рэліквія Хрыста.
**10.00, 14.45, 20.10** Даследчык 2.0.
**10.45, 15.30** Сіла племені.
**11.35** Сапраўдны суперкар.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**16.20** Экстрэмальныя даследчыкі.
**21.45, 1.40, 4.50** Падводныя тайны Галіполі.
**22.35** Зона 51.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Разбуральнікі легенд.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Паляўнічыя на склады.
**11.00, 1.00, 7.10** Дзікая кухня.
**12.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**13.00, 20.00, 6.20** Загадкі планеты Зямля.
**15.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Хлопцы з Юкана.
**19.00** Паездка ўлегцы.
**22.00** Выжыць разам.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00** Пешшу ўздоўж Ніла.
**2.00, 4.40** Багажныя войны.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Аўторак, 7 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05. 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55** Уступныя іспыты па беларускай мове ў V клас гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій-каледжаў мастацтваў.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Серыял «Айцец Мацвей».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.15 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.10** Капейка ў капейку.
**11.45** «Разбуральнікі міфаў».
**12.50, 17.15 Серыял «Вароніны».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
16.15 Трылер «Закрытая школа».
18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцця сусветная».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.35 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.40, 18.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 18.20** «Размаўляем па-беларуску».Тэлевіктарына.
**8.20, 16.45 «Сеткавая пагроза». Серыял. 1-я серыя.**
**9.15 «Угрум-рака». Драма. «Громавы».**
**10.35** «Я гляжу сквозь тебя...» Песні Юрыя Візбара.
**11.30 «Луной был полон сад». Драма.**
**13.15** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, музыканта, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Леаніда Смялкоўскага.
**14.00** «Час кіно».
**14.05 «Няспешная вясна». Меладрама.**
**16.15** «Камертон». Заслужаны артыст Расіі Аляксандр Дольскі.
**17.35, 23.35** «Дыя@блог». Правечнае.
**18.25, 21.15** «Валерый Чкалаў». «Выпрабаванне характару», «Дыстанцыя смерці».
**19.20 «Угрум-рака». Драма. «Анфіса».**
**20.40** «Калыханка».
**22.10 «Золата». Драма.**

### Беларусь 5

**7.40** PRO спорт. Вынікі.
**8.10** Час футбола.
**8.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Першы матч.
**10.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Крумкачы» (Мінск) — «Нафтан» (Наваполацк).
**13.00** На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**13.30, 19.55** Тэніс. Турнір WTA. Хертагенбаш.
**15.30** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Сафія.
**17.50, 23.05** PRO спорт. Навіны.
**17.55** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Беларусь — Шатландыя. (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**22.00** Спорт-кадр.
**22.30** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**23.25** Адзін дзень на шляху да Алімпу. Мастацкая гімнастыка. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Таты дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Практыка».**
**22.55** «Вызваленая Еўропа».
**23.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Драма «Усё як мае быць».**
**15.40** Дак. фільм «Дзеці іншых планет».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**23.40** Канцэрт «Дзве сястры — Беларусь і Расія». 1-я частка.
**0.25 «Пантэра». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 0.50 Маст. фільм «Усё вырашае імгненне».**
**11.15 Маст. фільм «Цётка Клава фон Гетэн».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Цяжар абеду».
**13.45, 19.20 Серыял «Які památ...**

**13.45, 19.20 Серыял «Які памнажае смутак».**
**15.30, 2.30** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. цыкл «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Дом узорнага ўтрымання».**
**21.05 Маст. фільм «Белая ноч, пяшчотная ноч».**
**22.55 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**2.55** «Іншы свет».
**3.20** «Народы Расіі».
**4.10 Маст. фільм «Дзяўчына з характарам».**
**5.35** «Зроблена ў СССР».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35 Маст. фільм «У Парыж!»**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Мар'ін гай-2».**
**19.10, 20.50 Серыял «Водар шыпшыны».**
**21.55, 23.10 Серыял «На далёкай заставе».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.00, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Выкідала».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 20.05, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.10 Серыял «Вечнасць».**
**8.15, 18.10 Серыял «Складанасці».**
**9.35 Серыял «Пад купалам».**
**10.20** «Кінаблакнот».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Камедыя «Дваццаць адно».**
**13.00 Серыял «Каўчэг».**
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.15, 18.00, 19.55, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**19.30** «Свой фермер. Другі сезон».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Які бяжыць у лабірынце».**
**23.10 Серыял «Торн».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 22.50, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Пушкін».
**11.30** Меладрама «Выпрабавальны тэрмін».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Баявік «Касякі».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Станцыйны наглядчык». Маст. фільм.
**12.25** «Энігма. Эвелін Глені».
**13.10, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.40** «Пятае вымярэнне».
**14.10, 0.20** «Іваноў». Серыял.
**15.10, 22.15** «Узыход цывілізацый». Дак. серыял.
**16.00** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.40** Прарок у сваёй айчыне. «Сцяпан Макараў. Неспакойны адмірал».
**17.10** Марта Аргерых. Канцэрт у Варшаве.
**18.00** «Пётр Вельямінаў. Людзі. Ролі. Жыццё». Дак. фільм.
**18.30, 1.55** «Паліглот». Кітайская з нуля за 16 гадзін!
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.10** «Гульня ў бісер». «У.У. Набокаў. «Запрашэнне на пакаранне смерцю»».
**21.50** Галасы XXI стагоддзя. Ільдар Абдразакаў.
**23.05** Да 80-годдзя кінастудыі «Саюзмультфільм». «Абрабаванне па...- 2». М/ф для дарослых.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Саюзмультфільм. Бязважкае жыццё». Фільм 1-ы.
**1.10** «Геты неўтаймоўны Жалё-Кюры». Дак. фільм.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Гурт «Агата Крысці».
**6.45, 7.55, 8.45, 11.05, 12.55, 14.30, 15.40, 19.00, 20.50, 21.40, 23.00, 0.55, 1.30, 5.30** Музычная настальгія.
**7.00** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе».
**8.10** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**9.00** Маст. фільм «Маленькая Вера».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Забароненая музыка». 2004 год.
**13.20** Маст. фільм «Ехалі мы, ехалі».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.00** «Філасофія лёсу».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітскоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год.
**19.20** Маст. фільм «Дзікі сабака Дзінга».
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае. 2010 год.
**1.10** Маст. фільм «Дзе гэта бачылі, дзе гэта чулі».
**2.00** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Жыве такі хлопец».

### EuroSport 1

**3.30, 9.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**4.00, 11.00, 21.30** «Яго Вялікасць футбол».
**5.00, 12.00, 15.00, 18.15, 1.30** Тэніс. Турнір ATP.
**6.30, 14.00, 17.00, 23.00, 2.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**7.45** Тэніс. «Ралан Гарос». Найлепшае.
**8.45, 10.00** Watts.
**9.30** Футбол. «Дарога на еўра».
**21.00** «Спорт знутры».
**0.00** «Дарога да золата».
**0.30** Ралі. За кулісамі ERC.
**1.00** Ралі-рэйд.

### Камедыя

**1.05** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
**2.50** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**4.30** Камедыя «Мой самы страшны кашмар».



**6.15** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**7.55** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**9.30** Камедыя «Ох, ужо гэты водпуск».
**11.05** Камедыя «Пiжон».
**12.50** Серыял «Былыя».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.10** Камедыя «Справа ў табе».
**17.50** Камедыя «Жудасны Генры».
**19.30** Камедыя «Спытайце Сінdзі».
**21.20** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**22.55** Меладрама «Даю год».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар I...»
**8.10, 19.00, 1.40** «Падарунак лёсу». Серыял.
**9.55, 3.50** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.35** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.50** «Хатні рэстаран».
**12.45** «Магія прыгажосці».
**13.40** «Тайныя знакі».
**14.35** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
**16.00** «Назад у СССР». Серыял.
**17.00, 21.50** «Рэвізора».
**18.00** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 0.55** «М.У.Р». Серыял.
**22.45, 5.25** «Зоркі і містыка».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.20** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.25** «Без кампрамісаў». Трылер.
**8.10, 4.20** «Лофт». Драма.
**10.00, 2.00** «Шоўк». Меладрама.
**11.55** «Джобс: Імперыя спакусы». Драма.
**14.10** «Сотавы». Трылер.
**15.50** «Капітан Крук». Фэнтэзі.
**20.10** «Сцежкі». Драма.
**22.10** «Чарнільнае сэрца». Фэнтэзі.
**0.10** «Гульня з агнём». Драма.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.50** Камедыя «Тры дзяўчыны».
**8.10, 2.20** Меладрама «На свеце жывуць харошыя і добрыя людзі».
**10.05** Драма «Не хлебам адзіным».
**12.10** Меладрама «Ваенна-палявы раман».
**13.50** М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».



**15.10** Драма «Я не вярнуся».
**17.10** Драма «І не было лепшага брата».
**20.20** Меладрама «14 +».
**22.20** Меладрама «Бумеранг».
**0.20** Драма «Пячорын».
**4.25** Дэтэктыў «Прэзумпцыя віны».

### National Geographic

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 13.40** Гульні розуму.
**7.10, 8.20, 13.10, 17.50, 21.45, 1.40, 4.50** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 17.05, 21.00, 0.55, 4.00** Чалавек супраць YouTube.
**9.10, 14.00, 18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**10.00, 14.45, 20.00** Падводныя тайны Галіполі.
**10.45, 15.30** Сіла племені.
**11.35** Сапраўдны суперкар.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**16.20** Экстрэмальныя даследчыкі.
**22.35** Асушыць акіян.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Загадкі планеты Зямля.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Багажныя войны.
**11.00, 7.10** Падарожжа ў невядомасць.
**12.00, 22.00** Хуткія і гучныя.
**13.00, 6.20** Навука магіі.
**15.00, 1.00, 5.30** Аўтальянцы.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Дзікая кухня.
**19.00** Голыя і напалоханыя.
**20.00** Выжыць разам.
**23.00** Поўны фарсаж.
**0.00** Прыроджаны механік.
**2.00, 4.40** Гаражнае золата.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Сядзі і глядзі

# ВЫПУСКНЫ ТЭЛЕМАРАФОН

**12 чэрвеня на маладзёжным канале «Беларусь 2» чарговы раз пройдзе тэлемарафон. У прамым эфіры гледачы змогуць паўдзельнічаць у займальных конкурсах і атрымаць арыгінальныя падарункі.**



Калі адгрымяць школьныя выпускныя, то «Двойка» не толькі павіншуе былых адзінаццацікласнікаў, але і прапануе ўсім, хто калі-небудзь прымяраў святочную стужку выпускніка, і тым, у каго такая падзея наперадзе, прыняць удзел у інтэрактыве.

Настальгіраваць па апошнім школьным світанку гледачы будуць у кампаніі нязменнага вядучага Ілы Конанава. У прамым эфіры ўсе ахвотныя змогуць падзяліцца здымкамі са сваіх выпускных альбомаў, а яшчэ вызначыць лепшыя прычоскі і сукенкі гэтага года.

— Мы чакаем актыўнасці не толькі ад сёлетніх выпускнікоў, але і ад тых, хто развітаўся са школай шмат гадоў таму. А будучым выпускнікам прапануем пафантазіраваць, якімі яны ўяўляюць свае выпускныя строі і з якімі прамовамі будуць развітвацца са сваімі настаўнікамі і аднакласнікамі... Тэлемарафон пройдзе ўжо чацвёрты раз (у мінулыя гады ў сацыяльных сетках нам дасылалі ад 8 да 12 тысяч паведамленняў). Сёлета чакаем рэкордную лічбу ўдзельнікаў, — дзеліцца сваімі спадзяваннямі тэлевядучы «Беларусь 2» Ілья Конанаў.

Нагадаем, 12 чэрвеня тэлемарафон будзе праходзіць увесь дзень. Для ўдзелу ў ім тэлегледачам неабходна размясціць фотаздымкі з выпускнога на афіцыйных старонках тэлеканала ў сацыяльных сетках з хэштэгам #двойкаэтокруто. Аўтары самых крэатыўных фота атрымаюць падарункі ад «Беларусь 2». Сачыце за эфірам і актыўна дзяліцеся сваімі запамінальнымі момантамі са школьных выпускных.

# КАНЦЭРТ ДЛЯ СЯБРОЎ

**9 чэрвеня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы (Мінск, вул. Янкі Купалы, 4) адбудзецца канцэрт Алеся Камоцкага.**



Традыцыя і проста добрая нагода для сустрэчы: вось ужо амаль 20 гадоў запар, у дзень свайго нараджэння, музыкант робіць свята для адданых прыхільнікаў беларускай песні і паэзіі. — Кожны год, у першай палове чэрвеня, пры любым надвор'і робім такі канцэрцік. Чакаю тых, хто ўжо тэме, і ўсіх, хто жадае прыяднацца да нашай кампаніі, — адзначыў у запрашальным слове бард.

У канцэрце возьмуць удзел гітарыст Алег Змушка, гітарыстка Алеся Лася, спявачка і мастацкі кіраўнік Народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» Алеся Сівохіна, прафесійная вакалістка, лідар гурта Dzivasil Іна Перасецкая-Малаковіч. У святочны вечар прагучаць пераважна пераклады ірландскіх балад, а таксама песні ў рытмах басановы. Пачатак у 19.00. Уваход свабодны.

**Алена ДРАПКО.**

■ Асобы

# ТЭАТР У «ВАЙНЕ БЕЗ АНТРАКТУ»

**На тэлеканале АНТ 6 і 13 чэрвеня выйдзе новы двухсерыйны фільм праекта «Зваротны адлік» — «Фаня Алер. Вайна без антракту». Кінакарціна расказвае пра лёс дырэктара Першага беларускага драматычнага тэатра, пра жанчыну, якая захавала беларускі тэатр у самыя складаныя гады ў гісторыі краіны.**



...У 1938-м, у самы разгар сталінскіх рэпрэсій, партыйнае кіраўніцтва БССР прыняло нечаканае рашэнне: прызначыць дырэктарам Першага беларускага драматычнага тэатра Фаню Алер, рэдактара партыйнай газеты. Гэта стала нечаканасцю нават для яе самой, бо яна да тэатра не мела ніякага дачынення. А тут адразу — дырэктарам... у галоўны тэатр рэспублікі. Жанчына спрабавала адмовіцца ад пасады. Але, у рэшце рэшт, вымушана была пагадзіцца.

Сітуацыя была вельмі рызыкоўнай. Тэатр — важны ідэалагічны інструмент. У выпадку чаго — спытаюць не з акцёраў і рэжысёраў, а з дырэктара. Папярэдні кіраўнік тэатра арыштаваны. Артысты спачатку глядзелі на Алер некалькі пагардліва: маўляў, прыслалі камісарку, якая нічога не разумее ў тэатральнай дзейнасці. Але Фаня была настроена рашуча і неўзабаве даказала, што ў тэатры яна чалавек невыпадковы.

Першым сур'ёзным выпрабаваннем для новага дырэктара стала Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. У тэатры вырашылі ставіць п'есу Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Аднак у Маскве зацвердзіць п'есу катэгарычна адмовіліся — занадта вострая! Старшыня Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў Храпчанка так і сказаў: «Вы з глузду з'ехалі! Крытыка савецкіх чыноўнікаў і ачарненне ўсяго савецкага народа? Гэта недапушчальна!» Але Фаня Яфімаўна адчувала: Сталіну — спадабаецца, ён любіць камедыі. Алер рашылася на дзёрзкі крок. Па праваму ўрадавай сувязі патэлефанавала ў прыёмную першага сакратара ЦК КПБ Панцеляймона Панамарэнкі. Той п'есу пачытаў і вынес вердыкт: «П'есу не толькі можна, але і проста неабходна ставіць!»

Дэкада беларускага мастацтва прайшла бліскуча. Тэатр узнагародзілі ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Кандрат Крапіва атрымаў Сталінскую прэмію, а Фаня Алер ордэн «Знак Пашаны». Разам з тым самыя цяжкія выпрабаванні былі яшчэ наперадзе. Набліжалася лета 41-га...

Прадзюсар праекта «Зваротны адлік» Уладзімір Бокун адзначае:

— Мы ўзяліся за гэтую працу, бо лічым, што асоба Фані Алер несправядліва забытая. Яна ўзначаліла тэатр у 1938-м — гэта пік сталінскіх рэпрэсій, затым — вайна. У чэрвені 41-га тэатр быў на гастролях у Адэсе. У горадзе — паніка, нікому няма справы да тэатра. І ў гэтай сітуацыі яна змагла «выбіць» для сваіх вагон у цягніку, каб з'ехаць у Маскву. А адтуль — у Томск. Там наладзіла жыццё акцёраў, працу тэатра. На спектаклях беларусаў заўсёды быў аншлаг. Затым — паездка на фронт. Тэатр сабраў сродкі, на якія быў пабудаваны баявы самалёт. Дзякуючы дырэктару тэатр шчасліва вярнуўся з эвакуацыі. Па сутнасці, у гэтыя цяжкія гады Фаня Алер выратавала яго. Нам удалося адшукаць у ЗША дачку Фані Яфімаўны — Клару Кузняцову, якая калісьці запісала ўспаміны маці. Яна расказала нам гісторыю гэтай жанчыны.

У фільме зняліся рэжысёр Мікалай Пінігін, дачка Фані Алер — Клара Кузняцова, а таксама народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Не прапусціце прэм'еру ў эфіры тэлеканала АНТ у панядзелак 6 чэрвеня.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

## Пятніца, 10 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55** Уступныя іспыты па беларускай мове, рускай мове і матэматыцы ў V клас гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій-каледжаў мастацтваў.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.25 Серыял «Жыць спачатку».**
**17.35** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**18.10** Лёс гігантаў.
**21.00** Панарама.
**21.35** Нашы.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Францыя — Румынія.
**0.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10** «Бітва экстрасэнсаў. Трэція сусветная».
**11.15 Серыял «Вароніны».**
**12.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30, 23.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10 Трылер «Закрытая школа».**
**17.25** «Разбуральнікі міфаў».
**18.30** Рэпарцёр.
**19.20 Камедыя «Людзі ў чорным-2».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. XII».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.20, 18.20, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.35** «Размаўляем па-беларуску».Тэлевіктарына.
**8.20, 17.00 «Сеткавая пагроза». Серыял.**
**9.15** «Роднае слова». Паэт Янка Лучына.
**9.40 «Угрум-рака». Драма. «Крах».**
**10.55** «Сіла веры».
**11.25 «Чакай мяне». Драма.**
**12.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці артысткі Біруты Дакальскай.
**13.45 «Масакра». Маст. фільм.**
**15.25** «Чаму ў бабра падрапаны нос?» Дак. фільм.
**15.40** «Славянскі базар-2010». «Майстры мастацтваў Расіі. Дзмітрый Хварастоўскі».
**17.50** «Камертон». Народная артыстка Расіі Алена Камбурава.
**18.35, 21.15** «Куміры. Назад у СССР». Дак. фільм. 2-я серыя.
**19.20 «Сувязь». Меладрама.**
**20.40** «Калыханка».
**21.55** «Расія — душа мая». Людміле Зыкінай прысвячаецца. Канцэрт.

### Беларусь 5

**7.35, 18.10, 23.30** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Канцэрт-адкрыццё на Марсавым полі.
**9.05** На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**9.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Крумкачы» (Мінск) — «Нафтан» (Наваполацк).
**11.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**12.00, 15.35** Тэніс. Турнір WTA. Хертагенбаш. 1/4 фіналу.
**14.00** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Жанчыны. Беларусь — Турцыя.
**17.40** «Жанчыны і спорт». Меліціна Станюта.
**18.20** Піт-стоп.
**18.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — ФК «Мінск».
**20.55** Футбол. Кубак Беларусі. Фінал.
**23.40** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Максім Перапаліца».**
**18.20** «Чакай мяне. Неверагодныя гісторыі пра жыццё».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Драма «Каралеўскі раман».**



**23.30** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**0.55** Легенды Live. «Аквариум».
**1.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.45** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Бамбу».**
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00 Трылер «Факультэт».**
**0.45** «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Любімыя акцёры».
**9.30 Маст. фільм «Яго звалі Роберт».**
**11.10, 0.05 Маст. фільм «Каханне пад прыкрыццём».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Трымайся, шоубіз!».
**13.45 Серыял «Які памнажае смутак».**
**15.30, 1.45** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Дом узорнага ўтрымання».**
**19.20 Маст. фільм «Сэрца трох».**
**2.10 Маст. фільм «Варатар».**
**3.35** М/ф.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Мая планета».
**12.00** «Людміла Зыкіна. Брыльянты адзіноты». «Чалавечы фактар. Бензін». «Чалавечы фактар. Чарадзейнае шкло».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Мар'ін гай-2».**
**19.10, 20.50 Серыял «Водар шыпшыны».**
**21.55, 23.10 Маст. фільм «Каханне без лішніх слоў».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.00, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.20** «НЗ. Расследаванне».
**19.40 Серыял «Выкідала».**
**22.45** «Большасць». Ток-шоу.
**23.50 Серыял «Дазнаўца».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 20.05, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.10 Серыял «Вечнасць».**
**8.15, 18.30 Серыял «Складанасці».**
**9.35 Серыял «Пад купалам».**
**10.30** «Свой фермер. Дзённік».
**10.45 Фантастыка «Трансформеры. Цёмны бок Месяца».**
**13.00 Серыял «Каўчэг».**
**14.10** «Кінаблакнот».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.15, 18.20, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**16.20** «Адшукваецца адпачынак».
**16.50 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Версія».**
**23.05 Серыял «Бойся хадзячых мерцвякоў».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 3.30** «Лаві момант».
**6.30, 23.05, 2.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30, 15.00** Серыял «Пушкін».
**11.30** Камедыя «Таксі 2».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 19.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**21.10** Камедыя «Таксі 3».
**00.30** Камедыя «Без ансамбля».
**01.30, 3.30** Скетчкам «Студэнты».
**02.30** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Наталі. Тры жыцці Наталлі Ганчаровай». Дак. фільм.
**11.15** «Нецярпімасць». Маст. фільм. Частка 2-я.
**12.30** Казкі з гліны і дрэва. Дымкаўская цацка.
**12.40** «Інакенцій Сібіракоў. Дапамажыце мне... Я страшна багаты!» Дак. фільм.
**13.40** «Пісьмы з правінцыі». Максаціха (Цвярская вобласць).
**14.10** «Іваноў». Серыял.
**15.10** «Чалавек лёсу. Сяргей Боткін». Дак. фільм.
**15.35** «Царская ложа».
**16.20** «95 гадоў музею-сядзібе. «Ясная Паляна. Леў Талстой». Дак. фільм.
**17.00** Дзяніс Мацуеў, Аляксандр Сладкоўскі і Дзяржаўны сімфанічны аркестр Рэспублікі Татарстан.
**17.50** «Франц Фердынанд». Дак. фільм.
**18.00** Да 80-годдзя кінастудыі «Саюзмультфільм». «Бязважкае жыццё».
**18.30, 1.55** «Паліглот». Кітайская з нуля за 16 гадзін!
**19.10, 2.40** Сусветныя скарбы.
**19.45** Смеханастальгія. Тацццяна Пельтцэр.
**20.15** «Шукальнікі». «Загадка архызскага цуду».
**21.00** «Я крочу па Маскве». Маст. фільм.
**22.15** «Лінія жыцця». Яўген Крылатаў.
**23.10** «80 гадоў кінастудыі «Саюзмультфільм». «Фільм, фільм, фільм». М/ф для дарослых.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Я вас кахаю». Маст. фільм.
**1.35** «Каралеўскі бутэрброд». «Парадоксы ў стылі рок». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацццяной Візбар: Вадзім і Валерый Мішчукі. 2007 год.
**7.00, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 15.40, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 0.55, 2.50, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Гракі».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.15** «Я сама». Тэма: «Я і мой муж пасля разводу». 1995 год.
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага року. Сяргей Курохін». 2006 год.
**13.20** Маст. фільм «І чорт з намі...»
**17.00** «Філасофія лёсу».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1958. 1-я частка. 2010 год.
**19.25** Маст. фільм «Не баліць галава ў дзятла».
**22.00** «Колба часу».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkoўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год.
**1.20** Маст. фільм «Дзікі сабака Дзінга».

### EuroSport 1

**3.30, 7.30, 9.00, 21.00, 22.00, 0.30** Футбол. «Дарога на еўра».
**4.00, 10.30, 22.30** «Яго Вялікасць футбол».
**5.00, 12.00, 15.00, 18.15, 1.00** Тэніс. Турнір АТР.
**6.30, 14.00, 17.00, 23.00, 2.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**23.00** Конны спорт. Кубак нацый.
**0.00** Watts.
**0.20, 2.20** Футбол. «Фанаты еўра».

### Камедыя

**0.35** Камедыя «Па-вар'яцку закаханы».
**2.25** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**4.10** Меладрама «Справа ў табе».
**5.50** Камедыя «На кручку».
**7.30** Камедыя «Спытайце Сіндзі».
**9.20** Камедыя «Шайбу! Шайбу!».
**10.55** Камедыя «Багіня».
**12.45** Серыял «Былыя».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Імя».
**17.55** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**19.30** Камедыя «Бамбу».
**21.15** Камедыя «Палярны рэйс».
**22.55** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.20, 18.55, 2.05** «Падарунак лёсу». Серыял.
**10.00, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.55, 4.25** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.55** «Хатні рэстаран».
**12.50** «Магія прыгажосці».
**13.40, 5.15** «Тайныя знакі».
**14.35** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
**16.00** «Магія ежы».
**16.55** «Рэвізора».
**17.55** «Сямейны дэтэктыў».
**20.50** «Секс па дружбе». Камедыя.
**22.45** «Гучная справа».
**23.40** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.15** «Раён №9». Фантастыка.

### ТБ1000

**6.10, 18.10** «Залатое стагоддзе». Драма.
**8.10, 2.10** «Кірмаш ганарыстасці». Трагікамедыя.
**10.35, 4.35** «Смерць на пахаванні». Камедыя.
**12.15** «Свет навокал». Меладрама.
**14.10** «Сацыяльная сетка». Драма.
**16.20** «Мільянер нехаця». Камедыя.
**20.10** «Якія не спяць у Сіэтле». Камедыя.
**22.10** «Мажэстык». Драма.
**0.45** «Паспадзявайся на сяброў». Меладрама.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.25** Драма «Карасі».
**8.20, 1.50** Драма «Ператварэнне».
**10.05, 4.20** Прыгоды «Сляды апасталаў».



**12.10** Драма «Алеся».
**13.40** Баявік «Рызыка без кантракту».
**15.05** Камедыя «Мамы 3».
**16.45** Драма «Экспірыенс».
**20.20** Меладрама «Здзіві мяне».
**22.00** Меладрама «Тры таварышы».
**23.40** Камедыя «Атамны Іван».
**3.15** Драма «Дэманы».

### National Geographic

**6.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.40** Гульні розуму.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 17.05, 21.00, 1.00, 3.40** Міграцыі.
**8.20, 15.30, 17.50, 21.45, 1.40, 4.50** Інстынкт выжывання.
**9.10, 14.00, 19.30** Каралі шахт.
**10.00, 14.45, 20.10** Дзікі тунец.
**10.45** Сіла племені.
**11.35** Сапраўдны суперкар.
**12.20** Золата Юкана.
**16.20** Па слядах міфічных пачвараў.
**18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Тайны гісторыі.
**23.20** Джон Ф. Кенэдзі. Зніклая куля.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**2.30** Секунды да катастрофы.

### Discovery

**8.00** Глядзі ва ўсе вочы.
**9.00, 14.00, 19.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 19.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Грошы ў засеках.
**11.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.
**12.00** Браты Дызель.
**13.00** Разбуральнікі легенд.
**15.00, 7.10** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**16.00, 5.30** Махінатары.
**18.00** Востраў.
**20.00, 3.50** Хлопцы з Юкана.
**21.00, 2.00** Аляска: апошні рубеж.
**22.00, 2.55** Апошнія жыхары Аляскі.
**23.00** Залатая ліхаманка.
**0.00, 6.20** Паляўнічыя на склады.
**0.30** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00** Склады.
**1.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.05** Сапраўдныя аферысты.

# ПРА КОЛЕР І АДЦЕННІ

**Ці ведаеце вы, што ёсць цэлая навука, якая вывучае колер? Яна называецца каларыметрыя. Яна мае справу з усім, што адносіцца да колеру — ад тэорыі колеру ў мастацтве да фізікі электрамагнітнага выпраменьвання. Сярэдні чалавек можа адрозніць каля мільёна адценняў, але некаторыя жанчыны могуць бачыць амаль у сто разоў больш! Наступны раз, калі ваша жонка будзе спрачацца з нагоды колеру вашых чаравікаў, успомніце пра гэта.**



Сонца выглядае белым, калі глядзець на яго з космасу. Мы бачым яго жоўтым дзякуючы зямной атмасферы.

Існуюць немагчымыя колеры, якія занадта складаныя для чалавечага ўспрымання.

Большасці людзей сняцца каляровыя сны. Але тыя, хто вырас у эпоху чорна-белых тэлевізараў, могуць бачыць чорна-белыя сны.

У акулярах начнога бачання выкарыстоўваецца зялёны люмінафор, таму што чалавечае вока можа адрозніваць больш адценняў менавіта гэтага колеру.

Плашч матадора не абавязкова павінен быць чырвонага колеру, таму што быкі не адрозніваюць колераў. Кажуць, чырвоны абраны для таго, каб не былі прыкметныя плямы крыві, бо быка ў канцы карыды забіваюць.

Ізраільскі хімік Фернанда Патольскі вынайшаў саломінку для абароны ад згвалтавання на спатканні. Калі такую саломінку апусціць у напой, які змяшчае наркатычныя рэчывы, яна памяняе колер.

Маркёры часта робяць жоўтымі, таму што гэты колер не пакідае прыцемненых палос на ксеракопіі.

Згодна з даследаваннямі, рыжавалосым людзям можа патрабавацца на 20% больш анестэзіі, чым усім астатнім.

Сыр «Чэдэр» змяняе колер у залежнасці ад пары года і харчавання кароў. Каб пазбавіцца ад змен колеру, фермеры заўсёды падфарбоўваюць яго.

У 1980-х гадах навукоўцы прадэманстравалі, што энзімы зялёнай кавы могуць ператвараць кроў любой групы крыві ў тып 0, які лічыцца ўніверсальным донарам.

У ЗША пажарныя гідранты афарбоўваюць у залежнасці ад ціску вады ў іх.

Найстарэйшы і паважаны майстар па выраба алоўкаў фірмы «Crayola» Эмерсан Мозэр прызнаўся ў сваім дальтанізме, толькі сыходзячы на пенсію.

Традыцыя афарбоўваць простыя алоўкі ў жоўты колер бярэ пачатак у 1890-х гадах. У той час графіт для алоўкаў паступаў з Кітая, дзе жоўты — гэта колер каралеўскай дынастыі. Такім чынам вытворцы алоўкаў давалі зразумець, што ў іх — кітайскі графіт высокай якасці.

Некаторыя жанчыны — тэтрахраматы. Гэта значыць, што яны могуць успрымаць у сто разоў больш адценняў колеру, чым звычайны чалавек.

Ці ведаеце вы, што ў 1918 годзе лічылася, што ружовы колер адзення лепш падыходзіць для хлопчыкаў, а блакітны — для дзяўчынак? Вось вытрымка з рэкламнага часопіса таго часу: «Ружовы, больш рашучы і моцны колер, больш падыходзіць хлопчыкам, а блакітны, больш мяккі і далікатны, лепш для дзяўчынак».

## Нядзеля, 12 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.50 Меладрама «Жонка Шчірліца».**
8.30 Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-4».**
**10.50** «50 рэцэптаў першага».
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Камедыя «Барс і Лялька».**
**14.25** Каробка перадач.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «Гумар на вайне». Дак. фільм.
**16.45 Меладрама «Я не змагу цябе забыць».**
**20.05** Навіны надвор'я.
**20.30** Галоўны эфір.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Германія — Украіна.
**23.55** Клуб рэдактараў.

### Беларусь 2

**7.05, 21.10** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**7.40 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**9.35** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**10.40** «Універ-шэф».
**11.20** Ваша лато, Пяцёрачка.
**11.50, 13.25, 14.30, 15.30, 16.45, 18.00** «Найлепшы дзень на «Двойцы». Тэлемарафон.
**12.10 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**14.10 Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2».**
**17.00 Камедыя «Людзі ў чорным-2».**
**19.00 Трылер «На кручку».**
**21.45** Кіпень.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**23.05 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.20, 17.00, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 17.15** «Размаўляем па-беларуску».Тэлевіктарына.
**8.25, 22.55 «Акно ў Парыж». Камедыя.**



**10.15** «Бард-парад».
**11.00** «Наперад у мінулае».
**11.25** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**12.35** «Музеі Беларусі». Музей Беларускага Палесся.
**13.05** «Святыні Беларусі». Удзельскі касцёл Беззаганнага Зачацця Панны Марыі.
**13.35 «У бары брусніцы». Меладрама.**
**16.05** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў.
**17.20** Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2016».
**18.55 «Георг». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15** Закрыццё XVI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2016».

### Беларусь 5

**7.40, 22.50** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Плаванне. Міжнародны турнір (Барселона).
**9.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Уэльс — Славакія.
**11.10** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Англія — Расія.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Хертагенбаш.
**15.00** Адзін дзень на шляху да Алімпа. Сінхроннае плаванне. Відэачасопіс.
**15.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Агляд гульнявога дня.
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Турцыя — Харватыя.
**17.55** Піт-стоп.
**18.25** Фактар сілы.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Польшча — Паўночная Ірландыя.
**20.55** Плаванне. Міжнародны турнір (Барселона).
**23.00** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**23.30** «Жанчыны і спорт». Алена Леўчанка.
**23.55** Час футбола. Еўра-2016.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20 Камедыя «Сем нянек».**
**10.35** «ДОстояние РЕспублики: Роберт Раждзественскі».
**12.15** «Раманавы».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Адгадай мелодыю».
**16.50** Гандбол. Чэмпіянат свету. Кваліфікацыя. Беларусь — Латвія.
**18.40** Канцэрт, прысвечаны 45-годдзю фільма «Афіцэры» ў Крамлёўскім палацы.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35** «Брат 2». Праз 15 гадоў». Канцэрт.
**0.25 Камедыя «Лесвіца».**

### СТБ

**6.25 «Студэнты». Серыял.**
**8.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.30, 17.05** «Аўтапанарама».
**9.00 Мюзікл «Чыкага».**
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».

**13.40, 1.15 Драма «Дзве нядзелі».**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50** «Наша справа».
**17.35** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Камедыя «Не будзіце сабаку, які спіць».**
**22.05** Дак. фільм «Знахары».
**23.50** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** «Даведнік».
**6.30, 15.15** М/ф.
**7.00 Маст. фільм «Яраслаў».**
**9.00** «Культпрасвет».
**9.30** «Чаму я?»
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Віват, Гардэмарыны!».**
**12.45 Маст. фільм «Гардэмарыны 3».**
**14.45** «Цяжар абеду».
**16.15, 22.00 Серыял «Рабін-зон».**
**21.00** «Разам».
**0.05 Серыял «Бездань».**

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Эскадрон гусар лятучых».**
**10.05 Маст. фільм «Печкі-лавачкі».**
**12.00** Масква. Крэмль. Цырымонія ўручэння Дзяржаўных прэмій Расійскай Федэрацыі.
**13.15, 14.15 Маст. фільм «Дом, у якім я жыву».**
**14.00** Весткі.
**15.30** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка». Суперфінал.
**18.15, 22.30 Маст. фільм «Сонечны ўдар».**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**0.00** Дзень Расіі. Святочны канцэрт.

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.05** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**14.15** «Паедзем, паядзім!»
**15.05** НТБ-Бачанне. «Сусветная закуліса. Зараза».
**16.20 Серыял «Іржа».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.00** «Акцэнты тыдня».
**19.45** «Пазнякоў».
**20.00 Серыял «Гульня».**
**23.15 Серыял «Дазнаўца».**

### 8 канал

**9.00, 16.40, 19.00, 23.30** «Надвор'е».
**9.05, 16.45** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30** «Мой любімы гадавнец».
**11.00, 16.25, 18.50, 21.00** «Хатняя крама».
**11.10 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.45 Трылер «Вертыкальная мяжа».**
**14.40 Баявік «Скалалаз».**
**17.10 Серыял «Чыста англійскае забойства».**



**19.05 Драма «Адплата».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Кітайская галаваломка».**
**23.00** М/ф.

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Здаецца! З рамонтам».
**7.30** М/ф «Ёка».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Машыны казкі».
**8.30, 16.00** «Ералаш».
**9.00** «Хто каго на кухні».
**9.30, 3.30** «Лаві момант».
**10.00, 0.50** «Турбаміксер».
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.00** Серыял «Мамачкі».
**15.00, 19.30** «Уральскія пельмені».
**16.30, 23.30, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.20** Прыгоды «Падарожжа на Кон-Цікі».
**21.00** Баявік «Нястрымныя 3».
**23.05** Скетчкам «Студэнты».
**0.00** Еўрапейскі покерны тур.
**5.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Іду на навальніцу». Маст. фільм.
**12.55** «Аляксандр Бляяўскі». Дак. фільм.
**13.40** «Край мядзведзяў і коней — Цянь-Шань». Дак. фільм.
**14.35** «Андрэй Шмеман. Апошні падданы Расійскай імперыі». Дак. фільм.
**15.20** «Песні розных гадоў». Іосіф Кабзон, Валерый Халілаў і Сімфанічны аркестр Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.
**17.40** «Пешшу...» Масква памешчыцкая.
**18.10, 1.55** «Шукальнікі». «Сакрэтная місія архітэктара Шчусева».
**18.55** Кіно пра кіно. «Мы з джаза. Прачнуцца знакамітым». Дак. фільм.
**19.35** «Мы з джаза». Маст. фільм.
**21.05** «Яўген Мацвееў. Каханне і лёс». Дак. фільм.
**21.45** «Паднятая цаліна». Маст. фільм. 2-я серыя.
**23.20** «Адроджаны шэдэўр. З гісторыі Канстанцінаўскага палаца». Дак. фільм.
**0.20** «Матрос сышоў на бераг». Маст. фільм.
**1.30** «Хармоніум». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1958. 1-я частка. 2010 год.
**7.00, 8.30, 9.40, 11.00, 12.55, 14.40, 17.25, 18.40, 19.30, 20.50, 23.05, 1.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.25** Маст. фільм «Не баліць галава ў дзятла».



**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**12.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2006 год.
**13.15** «Зямля—Паветра». Алёна Свірыдава. 2003 год.
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Адыходзячы — адыходзь».
**18.00** «Акулы пяра». Канстанцін Кінчаў.
**19.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт гурта «Ліга блюза» ў Тэатры Эстрады. 1992 год.
**19.50** «Усё будзе так, як мы хочам!» VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.
**21.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. Сяргей Курохін». 2006 год.
**1.20** Маст. фільм «І чорт з намі...»
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EuroSport 1

**3.45, 2.30** Watts.
**4.00, 7.30** Тэніс. Турнір АТР.
**6.30, 9.40, 14.15, 22.45** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**9.30, 11.30, 0.15, 2.20** Футбол. «Фанаты еўра».
**10.30** Тэніс. Турнір WTA.
**11.40, 13.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**14.00** Веласпорт. «На коле».
**16.15, 21.30, 1.30** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**18.00** Лёгкая атлетыка. Міжнародны Гран-пры.
**20.00, 0.25** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.

### Камедыя

**1.20** Камедыя «Ракавая Лара».
**3.15** Скетчкам «Паміж намі».
**3.55** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**5.35** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**7.10** Камедыя «Ох, ужо гэты водпуск».
**8.45** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**10.30** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**12.15** Камедыя «Бамбу».
**14.00** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**16.00** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**17.35** Камедыя «Палярны рэйс».
**19.15** Меладрама «Даю год».
**21.00** Камедыя «Багіня».
**22.50** Меладрама «Любоўны пераплёт».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.25** «Паненка і кулінар».
**10.00, 5.10** «Далёка і яшчэ далей».
**11.00, 1.20** «Сіндром Дракона». Заключныя серыі.
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.30** «Рэвізора».
**20.15** «Без падману».
**21.10** «Людзі ў чорным 2». Камедыя.
**22.45** «Асцярожна, махляры!»
**23.15** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 16.45** «Якія не спяць у Сіэтле». Камедыя.
**8.00, 4.00** «Перакладчыца». Дэтэктыў.
**10.15, 2.15** «Як украсці брыльянт». Камедыя.
**12.00** «У промнях славы». Баявік.
**14.05** «Мажэстык». Драма.
**18.35** «Паспадзявайся на сяброў». Меладрама.
**20.10** «Каратэ-хлопец». Драма.
**22.35** «Жонка падарожніка ў часе». Меладрама.
**0.30** «Аналізуй тое». Камедыя.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.10** Меладрама «Тры таварышы».
**8.10, 4.20** Драма «Мой зводны брат Франкенштэйн».
**10.20** Трагікамедыя «Апошні забой».
**12.20** Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
**14.15** Меладрама «Здзіві мяне».
**18.10** Камедыя «Атамны Іван».
**20.20** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».



**22.40** Драма «Час пік».
**0.40** Камедыя «У стылі jazz».

**2.30** Камедыя «Вяселле па абмене».

### National Geographic

**6.00, 14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35** Чалавек супраць YouTube.
**8.20** Навука будучыні.
**9.10, 12.20** Золата Юкана.
**10.00** Незвычайныя промыслы.
**10.45** Інстынкт выжывання.
**11.35** Сапраўдны суперкар.
**13.40** Гульні розуму.
**14.00** Напад нацыстаў на ЗША.
**15.35** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**16.20** Дзікая прырода Расіі.
**21.00, 0.10, 4.00** Дзікае надвор'е.
**21.45, 0.55, 4.50** Спецвыпуск Nat Geo.
**22.35, 1.40, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**23.20** Секунды да катастрофы.
**2.30** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 14.00** Голыя і напалоханыя.
**9.00, 4.40** Апошнія жыхары Аляскі.
**10.00** Хлопцы з Юкана.
**11.00** Аляска: апошні рубеж.
**12.00, 23.00, 5.30** Залатая ліхаманка.
**13.00** Траса Калыма.
**15.00** Глядзі ва ўсе вочы.
**18.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**19.00** Трой.
**20.00, 3.50** Загадкі планеты Зямля.
**21.00, 2.00** Разбуральнікі легенд.
**22.00, 2.55** Хуткія і гучныя.
**0.00** Паляўнічыя на склады.
**0.30** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00** Склады.
**1.30** Паляўнічыя на рэліквіі.




## НЕ ЗАЎСЯГДЫ, ЯК НА ДЗЯДЫ

Гэта гісторыя адбылася недзе ў 50-я, 60-я гады мінулага стагоддзя, калі з вёсак ды мястэчак у нейкія больш буйныя гарады хадзілі пехам і найчасцей, вядома ж, на кірмашы. Яны тады ледзь не за свята лічыліся, так што пабываць на іх карцела кожнаму — і старому, і малому. Што ўжо казаць пра жанчын?!

Дзве з іх, ужо не маладзіцы, чарговы разок дабраліся ў наш райцэнтр, удосталь нахадзіліся там па рынку: нагаманіліся са знаёмымі, да нечага прыцаніліся і нават набылі, — сталі збірацца дамоў... Ну вядома ж, не без гасцінцаў! А па іх тады шмат хто ў закусачную хадзіў, што каля моста цераз Бярэзіну.

Зазірнулі туды і гэтыя дзве кабеты, стаяць каля прылаўка і думаюць, што ж ім купіць, што з кірмашу ў якасці гасцінца прывезці? Коржыкі дзецям яны ўжо бралі (імі, вядома ж, парадуеш, але не здзівіш), абаранкі і булачкі — таксама... А тут — па цэнніку бачаць — нейкае пюрэ прадаецца. Каштуе — капейкі... Гучыць загадкава...

— Можа, возьмем? — нясмела прапануе адна з жанчын.

— Давай, — згаджаецца другая. — Але ж каб ведаць, што гэта такое?

— Ды нешта ж, мусіць, ядомае? Калі тут прадаецца...

— А тады — колькі браць? Штук па пяць нам хопіць?

— Не, можна і па дзесяць, — шэпча ў адказ сяброўка. — Бо па кішэні ж.

Тым часам іх чарга падыходзіць.

— Што вам? — пытаецца ў першай дзеўка-буфетчыца.

— Нам абедзвюм — пюрэ, — і за сябе, і за сяброўку адказвае тая. — Па дзесяць...

— Замнога не будзе? — насцярожваецца дзяўчына.

— А ты не шкадуй! — адбрываюць не вяскоўкі. Ды самі сабе думаюць: «Мусіць жа нешта смачнае? І дэфіцыт, калі памногу не даюць?»

Буфетчыца між тым накіравалася ў кухню і хутка выйшла адтуль з поўнай каструляй бульбы-тоўчанкі.

— Што ты нам прынесла? — нават не зазірнуўшы ў яе абурыліся жанчыны. — Мы камоў і дома паямо, а тут — пюрэ ўзяць хацелі.

— Дык гэта ж пюрэ і ёсць, — патлумачыла буфетчыца. — Будзеце браць?

— Не! — у адзін голас выгукнулі жанчыны і кінуліся на выхад...

Паспяшаліся... Потым, ужо ў дарозе, удосталь нарагатаўшыся і стаміўшыся, шчыра пашкадавалі, бо тое пюрэ было б вельмі дарэчы: можна было б добра падсілкавацца... А так...

Упершыню, здаецца, яны вярталіся з кірмашу і галодныя, і без гасцінцаў.

**Анатоль Пальнскі,**
*г. Беразіно.*

## НАЗАД ДАРОГІ НЯМА

Вясковец Мікола любіў пачытаць газеты. «Складна піша!», — казаў сам сабе пра адных журналістаў. «Пісакі... Я не горай магу», — думаў пра другіх.

Думаў так думаў, а ўрэшце... сеў і напісаў. Пра што? Ды пра індыкоў: як іх даглядаць, як вырасціць — з уласнага, прычым багатага досведу.

Відаць, гэта і паспрыяла: неўзабаве яго артыкул з'явіўся ў друку. І чын чынам усё: загаловак зверху, тэкст — пасярэдзіне, прозвішча ягонае знізу, назва мястэчка таксама... А з яго, дарэчы, ніхто і ніколі ў газетах не пісаў... То чым не падстава для гонару?

Першай на гэту публікацыю адгукнулася суседка.

— Мікола, ты малайчына, — пахваліла яна, ветрам заляцеўшы ў хату, — складна напісаў — не падкапаешся!.. Дык гэта... Я чаго да цябе прыйшла? Ты ж калодзеж мой бачыў?.. Ну зусім там вада прапала! Напішы ў газету, га? Няхай дапамогуць.

Мікола хацеў быў сказаць, што ён не брэшуць... Але кабета, паклаўшы на лаўку шмат сала (трэба разумець, для падмазкі?), ужо знікла за дзвярыма...

А тут і пра ганарар паведамленне прыйшло: маўляў, налічаны грошы, трэба атрымаць.

Мікола, апрануўшы найлепшы пінжак, накіраваўся ў горад, лёгка знайшоў патрэбную ўстанову і ў хуткім часе выйшаў адтуль — з грашыма. Але ж не паспеў іх след абмацаць, як непадалёк загучала:

— Якія людзі!.. Мікола? Ты? Тут?.. Па якіх такіх справах?

Насустрач яму, з раскрытымі абдымкамі, ішоў сябрук — месціч, які некалі з'ехаў на ПМЖ у горад.

Ад яго ў Міколы сакрэтаў не было і нават быць не магло, выклаў усё як ёсць: пра сваё жыццё-быццё, пра індыкоў, пра артыкул...

— Няўжо надрукавалі? — здзівіўся зямляк. — І грошы заплацілі? А многа?

Мікола, каб пусціць трохі пылу ў вочы, добра такі прылгаў: суму ўтрая падвысіў. Затое эфект быў, што трэба! Земляку аж дух заняло!

— Дык гэта ж... Гэта грэх не абмыць! — заікаючыся, прамовіў ён праз паўзу...

І ўжо потым, за «абмываннем», стаў спавядацца, стаў жаліцца: маўляў, спіну гне на чужога дзядзьку, працуе, як чорны вол... А горад жа не вёска: хоць бы хто гэта ўбачыў, хоць бы добрае слова сказаў!..

— Слухай, а напішы пра мяне ў газету? — папрасіў Міколу сябрук. — Я зараз «беленькую» вазьму, усю паднаготную вылажу...

Мікола зноўку хацеў адмовіцца, казаў, што з артыкулам пра індыкоў выпадкова атрымалася, але ж хто яго слухаў?

...Праз гадзіну-другую яны з цяжкасцю развіталіся. Мікола — ужо без ганарару і часткі грошай, якія браў з дому, — прыйшоў на вакзал, разам з іншымі сеў чакаць аўтобуса. І, вядома ж, не моўчкі: хто хацеў, расказваў, чаго прыязджаў у райцэнтр, што дзе бачыў, купіў... Неяк неўпрыкмет выклаў сваё і Мікола.

— Дык гэта вы напісалі, як вырошчваць індыкоў? — захоплена спыталася адна з маладзіц.

— Ага, — аўтар аж пачырванеў ад гонару.

— А я вось в'етнамскіх свіней разводжу, — сказаў яму нейкі дзядзька. — Паехалі да мяне. Яшчэ ж не такі артыкул зглаголдаеш, — увесь раён іх разводзіць пачне!

— А я паўлінамі заняўся, — дадаў яшчэ адзін пасажыр. — Экзатычныя птушкі, прыгожыя. Ты б, можа, сфатаграфаваў мяне з імі і таксама ў газету? А я табе гарод узару.

— І пра каня майго можна ў раёнку цiснуць...

— А ў нас карова была, — пачулася з бакоў.

Нехта з буфета ўжо нёс паўлітра:

— Слухай, а давай той ганарар яшчэ раз замочым?

— Дык я таго... Не супраць, — сумеўся Мікола. — Праўда, грошай ад яго мала засталося.

— Дык мы скінемся. Ты хіба пасядзі, за кампанію...

Мікола, вядома ж, пасядзеў. Не без таго — трохі выпіў, распавёў яшчэ раз, як трэба вырошчваць індыкоў.

...Дамоў вярнуўся вечарам, без рубля, без пінжака, але шкадаваў не іх. Думаў, як гэта раней яму не стрэліла напісаць у газету? Людзі ж, аказваецца, чытаюць, цікавяцца — тымі ж індыкамі... І некаму ён дапамог...

Каб дапамагчы сабе (мінералкай, расолам), зазірнуў у халадзільнік і ўбачыў там сала, якое прынесла яго суседка.

Адступаць не было куды: вечарам Мікола сеў за новы артыкул.

**Андрэй Сідарэйка,**
*м. Каравацічы, Рэчыцкі раён.*

## ПАВЕРКА ЯКАСЦІ

Некалі, у часы СССР, на асобных таварах адмысловая пазнака была — у выглядзе пяцівугольніка, знака якасці. Для пакупнікоў гэта азначала адно: убачыў — бяры, не прагадаеш. Ды і наогул — тавары тады лепшымі былі: харчы больш натуральнымі, механізмы — надзейнымі, а потым...

Потым часы змяніліся, потым наш рынак, як кажуць гумарысты, запаланілі «кітайскія тавары з усяго свету». Не без таго — яны таксама бываюць добрымі. Але ж вытворцам гэта нявыгадна. Уявіце — вы нешта купілі і гадамі носіце, новае не купляеце, бо не трэба. Адпаведна — у тых «кітайцаў» ніякага тавараабароту, ніякага прыбытку.

Што зрабіць, каб ён быў? Ды зразумела ж: выпускаць тое, што раскупляецца, што выгадна. Тую ж віагру, напрыклад — каб у Еўропе прырастала насельніцтва, каб большала пакупнікоў. Гумарыстка Святлана Ражкова расказвала, што нейк з іх офіса (у падвале жылога дома) трохі «нямецкай» віагры выцекла. Дык што пачалося... Мужык адзін у тую лужыну чарвякоў упусціў па дарозе на рыбу. Яны тут жа пасталі, як цвічкі... Другі мужчына з той лужыны антэну працёр на сваім аўтамабілі — месяц потым скласці не мог. І трэці, алкаголік, паваляўшыся ў той лужыне, устаў і выпраміўся. Хаця да гэтага ў такім стане яго не бачыў ніхто... Што, вядома ж, сведчыць аб высокай якасці замежнага прадукту!

А наш, між іншым, не горшы! Узяць тыя ж самазвалы, прадукты харчавання, вырабы з лёну ці нават самую драбязу — аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. З імі ўжо многія «сутыкаліся», бо тыя пачыналі раўці не тое, што ад дыму, — нават ад прыкмет яго. Старыя тады кійкамі па іх цалялі (бо да столі ж прыкручаны). І нават, бывае, пацэльвалі, а яны ўсё адно не сціхалі... Бяда...

Але ж, можна сказаць, што бяда невялічкая. Мне тут днямі пра сапраўдную расказалі.

Дык вось, у адной досыць салідней дзяржаўнай установе вырашылі ўсталяваць пажарныя апавяшчальнікі. А чаму б і не, калі сцеражонага Бог сцеражэ і грошы ёсць? Стэлефанаваліся яны з вытворцамі, з'ездзілі на завод, пры закупцы партыі некалькі штук праверылі: усё як належыць — працуюць. Купілі, прывезлі тавар на «аб'ект», разгрузілі.

Туды ж, у невялічкі пакойчык, назаўтра з раніцы сышліся мужыкі — паселі дзе хто мог, сталі чакаць «адмашкі» на ўстаноўку. І пры гэтым, як водзіцца, закурылі...

Што далей было, вы, відаць, здагадаліся? Так-так, сігнал «Паветраная трывога» адпачывае, бо тут у адзін голас, можна сказаць, нема, пранізліва завылі, запішчалі, зараўлі... усе 500 беленькіх маленькіх монстрыкаў!

Нехта з мужыкоў кінуўся адчыняць дзверы, нехта — усе форткі...

Марна: «монстрыкі» добрасумленна выконвалі свае абавязкі, яны, так бы мовіць, апавяшчалі! І прымусіць іх «заткнуцца» магло толькі адно — адключэнне... Паўтысячы штук... Запакаваных...

А між тым ва ўстанове паніка: усе, хто быў у будынку, павыскаквалі на вуліцу, нехта выклікаў ратавальнікаў і на ўсякі выпадак хуткую.

Тыя, вядома ж, прыляцелі.

У выніку агульнымі намаганнямі, як любяць казаць у нашым тэлевізары, удалося нармалізаваць сітуацыю, прычым — «у рэкордна кароткія тэрміны»! Монстрыкі толькі з паўгадзінкі параўлі, потым — стала ціха... Можна сказаць, аглушальна ціха: ніхто нічога не казаў, ніхто не смяяўся.

«Прарвала» трохі пазней. Усіх... Нават ратавальнікаў. Яшчэ б — такія «вучэнні» правялі!

А галоўнае — як прыборчыкі сябе паказалі? Амаль як тая віагра!

...Што гаворыць аб высокай якасці нашага прадукту. Ці не так?

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## ■ Неасабісты суб'ектыў

# ЭКСКЛЮЗІЎНЫЯ КОСТКІ



### Пра попыт і прапанову

Як той казаў, у працяг тэмы. Зноў пра маркетынг, а калі прасцей — пра навуку прадбачыць і задавальняць інтарэсы спажыўца і ўменне прапанаваць тое, што хочаш прадаць. Прычым яго наяўнасць або адсутнасць сёння можна назіраць не толькі ў буйных супермаркетах і модных буціках, але і ў невялікіх вясковых крамках, якія пакуль трымаюцца, не зачыняюцца, дзе, можа, і слова такога не чулі...

У адной такой крамцы справа ледзь да сваркі ці зусім, крый Божа, да бойкі не дайшла. Цана пытання была — супавы набор. Ведаеце, прадаюцца такія — некалькі абрэзаных курыных спінак. Гаспадыні купляюць з ахвотай: і навар ёсць, і зусім нядорага. Дык вось, гэты самы набор у тую вясковую краму прывезлі ў колькасці адна штука (я не жартую). Ухапіла яго, вядома ж, тая, што стаяла ў чарзе першая. А чарга тая, скажу я вам, фарміруецца задоўга да прывозу тавару (як, памятаеце, у часы перабудовы было). Вяскоўцы лічаць, што лепш некалькі гадзін пачакаць у краме той машыны з прадуктамі, чым прыйсці ў свіныя галасы, калі ўжо нічога смачнага і патрэбнага не застанецца. Бо гэта ж вам не горад — тут асартымент у самым прамым сэнсе абмежаваны.

Вёску, пра якую ідзе размова, у дачны сезон можна смела назваць густанаселенай: сталіца недалёка, таму пустых хат тут улетку амаль няма. Гаспадарку трымае мала хто: пастаянныя жыхары ў пераважнай большасці людзі старыя ды нямоглыя, а дачнікі з жыўнасці вязуць з сабой катоў і сабак, ды, можа, яшчэ пару курэй у хлеве на лета завядуць. Карацей, зразумела, што попыт на малочныя прадукты, яйкі, мяса будзе немалы. І выбар павінен быць, калі, канешне, хтосьці зацікаўлены ў тым, каб атрымаць найбольшы прыбытак ад гандлю.

НАСАМРЭЧ машына, якую ганяюць амаль за трыццаць кіламетраў з райцэнтра, праехаўшы па больш блізкіх да горада крамах, прывозіць у аддаленую вёску адзін супавы набор, дзве булкі «Нарачанскага» хлеба (астатні — самы танны, мясцовы, шэранькі), чатыры пачкі мяккага недарагога тварагу (яго, як правіла, увесь забірае той, каму пашчасціла заняць чаргу першым, застаецца адчувальна даражэйшы, у пластыкавых «ванначках»), бутэлек дзесяць малака (яго ўсё роўна ўсім не хапае, даводзіцца купляць стэрылізаванае, якое, самі ведаеце, колькі каштуе), алей па дваццаць шэсць тысяч за бутэльку...

Што маем у выніку? Дзеці-ўнукі, што прыязджаюць на выхадных з горада на машынах, прывозяць сваім дачнікам «паёк» на тыдзень — і мяккі смачны хлеб, і малако патрэбнай тлустасці, і таннейшы тварог, і алей па дваццаць тысяч. Дачнікі ў магазін ідуць толькі па марожанае, мясцовыя выпівохі — па «чай». Прадавачка большую колькасць прадуктаў ужо і не заказвае: з такім раскладам могуць і не раскупіць, тады самой давядзецца пратэрмінаванае малако ды сапсаваны тварог за ўласныя грошы выкупляць ды свіням дома аддаваць. У раёне садзяцца за падлікі і прыходзяць да высновы: ад гэтага магазіна адзін урон, трэба зачыняць і пускаць аўталаўку. Вёска, у якой магазін застаецца адзіным месцам, дзе можна сустрэцца, пагаварыць дый проста паглядзець адно на аднаго, пачынае бурліць. Людзі абураюцца, збіраюцца скардзіцца ва ўсе інстанцыі. Прадавец сыходзіць на пенсію: навошта ёй такія хваляванні за зусім невялікую зарплату. Пастаянную замену ёй шукаюць і не знойдуць днём з агнём з той жа прычыны. Пытанне аб закрыцці магазіна вырашана амаль канчаткова.

КАМУ ад гэтага стане лепш? Людзям, якія пазбавяцца магчымасці купіць самае неабходнае кожны дзень, а не два разы на тыдзень? Раённай спажывецкааперацыі, якая не атрымае таго ж прыбытку ад аўталаўкі, як ад крамы, нават ад той, што працуе «ва ўрон»? А можа, гэтай самай спажывецкааперацыі варта было б паспрабаваць заняцца тым самым маркетынгам? Праявіць гнуткасць, мабільнасць, падстроіцца пад сітуацыю (у нашым выпадку пад дачны сезон). Завезці больш прадукцыі, розных вытворцаў, па розных цэнах, каб у людзей быў выбар. Забіраць назад пратэрмінаваны тавар, калі такі з'явіцца, а не вешаць матэрыяльную адказнасць на прадаўца. Увесці сістэму зніжак. У вёсцы? А чаму б не?! Глядзіш, і ўрон бы пакрысе ператварыўся ў прыбытак.

Усё напісанае вышэй — трызненне ідэаліста? Магчыма, але ж ніхто нават не паспрабаваў зрабіць хоць штосьці. Прасцей прыняць рашэнне «аб ліквідацыі гандлёвай кропкі з-за нерэнтабельнасці». Вялікай бяды для эканомікі, здаецца, тут няма. Але калі палічыць, колькі падобных «нерэнтабельных» вясковых крамак зачынілі ці рыхтуюцца зачыніць... «Нерэнтабельных» менавіта з-за няўмення і нежадання прадбачыць і задавальняць інтарэсы спажыўца і прапанаваць тое, што хочаш прадаць. Гэта ж цэлая навука, якую трэба спасцігаць. Прасцей жа палічыць «урон», а людзям, пакуль вырашаецца пытанне аб ліквідацыі, кінуць на ўсю вёску адну костку (ці супавы набор).

ДАРЭЧЫ, булён з тых касцей атрымаўся вельмі наварысты. А можа, толькі здалося так, улічваючы іх «эксклюзіўнасць»?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1** — надувная лодка «КАЙМАН-380», комплект №1, ввод в экспл. апрель 2009, в исправном состоянии, инв. №10252.<br>Стоимость объекта — 6 476 150 рублей.<br>**Лот № 2** — мотор лодочный подвесной «ХОНДА», ввод в экспл. июнь 2009, в рабочем состоянии, инв. №10261.<br>Стоимость объекта — 24 417 500 рублей.<br>**Лот № 3** — мотор лодочный подвесной «ХОНДА», г.в. 2010, в рабочем состоянии, инв. №10305.<br>Стоимость объекта — 5 614 500 рублей.<br>**Лот № 4** — прицеп лодочный ЛАВ-81015, гос. № А1436А2, в исправном состоянии, г.в. 2009.<br>Стоимость объекта — 7 180 100 рублей.<br>**Лот № 5** — автокран КС 3577, гос. № ВА5948, г.в. 1991.<br>Стоимость объекта — 36 331 800 рублей.<br>**Лот № 6** — автокран КС 3575, гос. № 2347 ВТП, г.в. 1990.<br>Стоимость объекта — 46 504 400 рублей.<br>**Лот № 7** — трактор МТЗ-82, гос. № 3702 ВЕ, г.в. 1982.<br>Стоимость объекта — 31 983 650 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ДКУСП «Шарковщинская ПМК-68» (УНП 300033719) |
| Наличие обременений | отсутствуют |
| Местонахождение (адрес) имущества | Витебская область, г.п. Шарковщина, ул. Рабочая, 1 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 17.06.2016 в 10.00,<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3<br>Судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич — тел.факс. (80212) 614023, (8033) 6879136.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович — тел. (80212) 614015 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 16.06.2016 г.<br>Минимальная величина первого шага — 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1** — автомобиль Kia SPORTAGE, гос. номер 5555ВА-2, 2007 года выпуска, в технически исправном рабочем состоянии.<br>Стоимость объекта — 118 280 000 рублей.<br>**Лот № 2** — автокран КС-45729А, гос. номер АА8703-2 2006 года выпуска, в рабочем состоянии.<br>Стоимость объекта — 320 380 000 рублей |
| Собственник (владелец) имущества | ДКУСП «Миорская ПМК-55» (УНП 300069937) |
| Наличие обременений | отсутствуют |
| Местонахождение (адрес) имущества | Витебская область, г. Миоры, ул. Коммунистическая, 47 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 17.06.2016 в 14.30<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3.<br>Судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич, тел.факс (80212) 614023, (8033) 6879136.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович — тел. (80212) 614015 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 16.06.2016 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by |

**Филиал СООО «Белкоопстрах» в г. Минске просит признать недействительными:**

- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0875202, 0875204, 0789235-0789240, 0511292, 0511297, 0511298, 0554961-0554968, 0554970, 0584023,0584027, 0831793, 0831794, 0511314, 0558608, 0865955, 0771221, 0805966;

- бланк квитанцию о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС №№ 08717934-08717945, 08717952, 04326919-04326920, 04330121-04330123, 08717949-08717950, 08717946, 08721131-08721200;

- страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта», серии BY/12/ №№ 9814663-9814670, 10804824-10804825, 12231124, 10804898, 10804901, 10804902, 11523211, 10804808;

- страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВА № 3949488;

- страховой полис по договору страхования, заключаемый с физическим лицом (формы 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (формы 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни 2РН, 2РП серии БК № 0178722.

УНП 100 706 519

## ОДО «ВлаНас-Сервис»
**(УНП 190572355)**

объявляет о начале процесса реорганизации в форме выделения из него ООО «ПозитивАвтосервис Плюс».

Претензии кредиторов принимаются в течение 1 (одного) месяца по юридическому адресу ОДО «ВлаНас-Сервис» — 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 10, оф. 319В.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**1. Сведения об организаторе конкурса:**

1.1 полное наименование: Комитет по сельскому хозяйству и продовольствию Витебского облисполкома;

1.2 место нахождения: 210015, г. Витебск, ул. Гоголя, 14;

1.3 адрес электронной почты: admin@agro.vitebsk.by;

1.4 фамилия, имя, отчество секретаря комиссии: Гребнев Станислав Владимирович;

1.5 номер телефона секретаря комиссии: +375 212 37-24-62.

**2. Информация о конкурсе:**

2.1 вид конкурса: открытый конкурс;

2.2 предмет конкурса: право на заключение договора на выполнение мероприятия государственной программы;

2.3 дата проведения конкурса: 11.07.2016 г.;

2.4 время проведения конкурса: 15.00;

2.5 место проведения конкурса: Комитет по сельскому хозяйству и продовольствию Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Гоголя, 14, каб. 52;

2.6 порядок проведения конкурса: конкурс проводится в порядке, определенном пунктами 25-30 Инструкции о порядке проведения конкурсного отбора исполнителей мероприятий государственных программ, не являющихся подчиненными бюджетными организациями, утвержденной постановлением Министерства сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь от 21 марта 2016 г. № 11 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 09.04.2016, 8/30822).

**3. Информация о мероприятии:**

3.1 наименование государственной программы: Государственная программа развития аграрного бизнеса в Республике Беларусь на 2016 — 2020 годы, утвержденная постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2016 г. № 196 «О Государственной программе развития аграрного бизнеса в Республике Беларусь на 2016 — 2020 годы и внесении изменений в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 16 июня 2014 г. № 585» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 26.03.2016, 5/41842);

3.2 наименование подпрограммы: подпрограмма 8 «Сохранение и использование мелиорированных земель»;

3.3 название мероприятия: «Строительство, в том числе реконструкция, осушительных, осушительно-увлажнительных систем и основных сооружений мелиоративных и водохозяйственных систем; выполнение ремонтно-эксплуатационных работ, в том числе в рыбоводных прудах и на водохозяйственных сооружениях, включая работу насосных станций по заполнению водой водохранилищ»;

3.4 ориентировочные сроки выполнения мероприятия:

| Начальный срок выполнения мероприятия | Конечный срок выполнения мероприятия |
|---|---|
| 2016 | 2020 |

3.5 ожидаемые результаты от выполнения мероприятия для заказчика государственной программы: ввод в эксплуатацию к концу 2020 года 5,9 тыс. гектаров площадей реконструированных мелиоративных систем и 1,1 тыс. гектаров мелиорированных сельскохозяйственных земель; обеспечение к 2020 году поддержания оптимального водного режима для выращивания сельскохозяйственных растений на площади 0,155 млн гектаров осушенных земель, ежегодные сводные данные государственного учета мелиоративных систем, данные инвентаризации мелиоративных систем в 2019 году, проект подпрограммы «Сохранение и использование мелиорированных земель» на последующие 5 лет в 2020 году;

3.6 ориентировочный размер средств областного бюджета, предоставляемых исполнителю мероприятия на выполнение мероприятия: 437,6 млрд рублей;

3.6.1. ориентировочные сроки предоставления исполнителю мероприятия средств областного бюджета на выполнение мероприятия: в течение 2016 — 2020 гг.;

3.7. требования к качеству выполнения мероприятия: выполненные работы должны соответствовать утвержденной проектно-сметной документации и требованиям технических нормативных правовых актов.

**4. Информация об определении участника, выигравшего конкурс:**

4.1. участником, выигравшим конкурс, признается участник, предложивший лучшие условия для заключения договора на выполнение мероприятия по сравнению с условиями, предложенными другими участниками;

4.2 описание критериев определения участника, выигравшего конкурс, способ оценки критериев определения участника, выигравшего конкурс:

| Описание критериев определения участника, выигравшего конкурс | Способ оценки критериев определения участника, выигравшего конкурс |
|---|---|
| 1. Опыт осуществления функций заказчика, не менее 5-ти лет | Оценка производится по бальной системе.<br>При выполнении базового условия — 10 баллов. За каждый дополнительный год — + 1 балл.<br>При невыполнении базового условия — 0 баллов |
| 2. Наличие специалиста, аттестованного по специализации «руководитель (управляющий) проекта» по мелиоративному строительству | Оценка производится по бальной системе.<br>При выполнении базового условия — 10 баллов. За каждого дополнительного аттестованного специалиста — + 1 балл. При невыполнении базового условия — 0 баллов |
| 3. Наличие разработанной проектно-сметной документации по объектам мелиоративного строительства под план 2016 года | Оценка производится по бальной системе.<br>При выполнении условия — 10 баллов.<br>При невыполнении базового условия — 0 баллов |
| 4. Срок внедрения аттестованной системы менеджмента качества в строительстве, соответствующей требованиям СТБ ISO 9001-2009 | Оценка производится по бальной системе.<br>При невыполнении базового условия — 0 баллов<br>При выполнении условия:<br>До 5-ти лет — 2 балла.<br>Более 5-ти лет — 5 баллов |

4.3. формула способов оценки критериев определения участника, выигравшего конкурс: по наибольшей сумме баллов.

**5. Перечень условий, включаемых в договор на выполнение мероприятия:**

1) перечень условий о выполнении мероприятия:

объем выполнения мероприятия;

сроки выполнения мероприятия;

2) источник (соответствующий бюджет), размер и сроки финансирования мероприятия;

3) результат выполнения мероприятия для заказчика государственной программы;

4) результат выполнения мероприятия для исполнителя мероприятия;

5) перечень условий (требований) к качеству выполнения мероприятия;

6) порядок и сроки приемки результата выполнения мероприятия;

